Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 СНЕЖНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №242 (28606)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хто і як стварае пазітыўную раніцу на ТБ**

СТАР. 5



**Цікавыя гісторыі нашых чытачоў**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, міністр інфармацыі:**

*«Інфармацыйная бяспека па сваёй змястоўнай сутнасці — вельмі простае паняцце: засцерагчы ўсіх, хто карыстаецца інфармацыяй, ад уплываў, патокаў, якія імкнуцца перавярнуць свет. Пытанне аб неабходнасці стварэння бяспекі на медыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы ці Беларусі, і Расіі. Для гэтага ў нас ёсць цэлая лінейка не проста дзяржаўных СМІ (як у Беларусі, так і ў Расіі), не проста грамадскіх, прыватных сродкаў масавай інфармацыі ў нашых дзяржавах, але і цэлая лінейка інтэграцыйных масмедыя, якія ўжо завявалі аўтарытэт у свайго гледача, падпісчыка, чытача».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0277 | ▼ |
| Еўра | 2,3963 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0345 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0739 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Казкі старога млына



Фота БЕЛТА.

**Млын у вёсцы Дворышча Лідскага раёна, пабудаваны ў XIX стагоддзі, яшчэ нядаўна ўяўляў сабой адны тоўстыя старыя сцены. Пасля таго як аб'ект нерухомасці быў выстаўлены на аўкцыён, яго набыла турыстычная фірма Генадзя Конана. Адрэстаўраваўшы стары будынак, максімальна захаваўшы яго аўтэнтычнасць, цяпер тут плануюць зрабіць музей з тэматычнымі экспазіцыямі. У гэтым памяшканні, дзе Яўген ЖЫГАЛА і Артур ЧАРНЮК устанаўліваюць фігуру рыцара, будзе расказвацца пра эпоху Сярэднявечча.**

■ Традыцыі

## ПА РЭЦЭПТАХ БАБУЛЬ

**Як звычайная віцебская школа можа стаць цікавым турыстычным аб'ектам**



**Свята беларускай кухні ў віцебскай сярэдняй школе №29 імя В. В. Піменава з цягам часу перарастае рамкі школьнага. Калі на сталы тут нясуць з навакольных дамоў дранікі, свойскую каўбасу, мачанку і верашчаку, калдуны, клёцкі, бульбяную бабку і падобнае, то, вядома, ніводная сям'я, дзе ёсць вучань з гэтай школы, не застаецца ўбаку.**

СТАР. 4

■ Руплівым гаспадарам

## МІСІЯ: ДАЖЫЦЬ ДА ВЯСНЫ,

**або Колькі можа пратрымацца беларускі яблык?**

**Дзякуючы рабоце селекцыянераў сёння спажывец можа купляць айчынныя яблыкі круглы год. Асобныя сарты здольныя ляжаць да вясны. Але, каб захаваць ураджай як мага даўжэй, трэба ведаць пэўныя сакрэты. І беларускія вучоныя гатовы імі падзяліцца.**



Навуковы супрацоўнік аддзела захоўвання і перапрацоўкі Галіна НОВІК.

Мы завіталі ў аддзел Інстытута пладаводства НАН Беларусі, які займаецца распрацоўкай і ўдасканаленнем тэхналогій захоўвання пладовых і ягадных культур. У доследных камерах тут сёння можна ўбачыць некалькі сартоў яблыкаў. Справа ў тым, што для розных пладоў патрабуюцца неаднолькавыя ўмовы. Нават тэмпературу трэба падбіраць «індывідуальна». Так, калі адным сартам ідэальна падыдзе чатыры градусы, іншым трэба яшчэ менш. У інстытуце назіраюць за тым, як сябе паводзяць плады і ў звычайнай атмасферы, і ў рэгуляваным газавым асяроддзі. У асобных модулях можна задаваць умовы з рознай колькасцю кіслароду і вуглякіслага газу.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!**

**КУПОН ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ на 5-й стар.**

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАЦКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА Ў ДЗЕЯННІ

## Парламентарыі прапанавалі змены ў заканадаўства аб прыватызацыі

**Работа над заканадаўствам — справа даволі складаная, яна патрабуе шмат часу, пільнасці і, безумоўна, грунтоўнага досведу. Звычайна праект закона — вынік сумеснай працы профільнага ведамства і парламентарыяў. Але апошнія і самі карыстаюцца заканадаўчай ініцыятывай і ўласнымі намаганнямі распрацоўваюць нарматыўныя дакументы. Учора ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дэпутаты разгледзелі і прынялі ў першым чытанні такі праект закона.**

Яго ўнеслі **Леанід БРЫЧ і Сяргей ЗЯМЧОНАК, намеснікі старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.** Гэты дакумент прапануе змены і дапаўненні ў Закон «Аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці і пераўтварэнні дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы».

Як растлумачыў журналістам Леанід Брыч, «асноўнай ідэяй названага законапраекта стала рэалізацыя палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны да 2020 года». Дэпутаты прапануюць унесці ў заканадаўства шэраг навацый:

— Па-першае, прыбралі планавасць аб'ектаў прыватызацыі, бо тое, што існуе ў цяперашнім законе, як паказвае жыццё, не зусім сябе апраўдвае. Па-другое, пачатковы кошт продажу прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў, гэтак жа, як і акцый гаспадарчых таварыстваў дзяржаўнай уласнасці, вызначаецца па рынкавых цэнах у парадку, які ўстанаўліваецца Саветам Міністраў.

Акрамя гэтага, некаторыя палажэнні Закона «Аб прыватызацыі...» прыведзены ў адпаведнасць з Законам «Аб гаспадарчых таварыствах».

— Самае важнае, ключавое — гэта памяншэнне тэрміну іскавай даўнасці (па прыватызацыйных здзелках у Беларусі. — **Аўт.**) з дзесяці да трох гадоў, — дадаў дэпутат. — Мы лічым, што гэта пасадзейнічае больш эфектыўнай карпарацыйнай кіруемасці арганізацыі з дзяржаўным удзелам і абароніць уласнасць інвестара.

**Адам КАВАЛЬКА, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі,** прадставіў у другім чытанні праект закона, што ўносіць дапаўненні ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь:

— Раней у нас быў прабел у Крымінальна-працэсуальным кодэксе, бо сведка не меў права на адваката. Вельмі часта былі выпадкі, калі сведка пераходзіў у падазраванага або нават у абвінавачваемага. Таму было прынята рашэнне Канстытуцыйнага суда, каб усё-такі даць права сведку мець адваката.

**Міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ** выступіў дакладчыкам па праекце закона, які ратыфікуе Канвенцыю аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых формаў утрымання сям'і. Адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, кіраўнік ведамства запэўніў, што гэта Канвенцыя для нашай дзяржавы адыграе значную ролю ў тым, што датычыцца абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей.

— Сёння складваецца сітуацыя, калі ў дачыненні да шэрагу еўрапейскіх дзяржаў (калі бацькі, абавязаныя выплачваць сродкі на ўтрыманне дзяцей, пражываюць там. — **Аўт.**) дастаткова складана спагнаць аліменты, — звярнуў увагу міністр. — Калі даўжнік па аліментах, напрыклад, бацька дзіцяці, пражывае на тэрыторыі краіны Еўрапейскага саюза або на тэрыторыі ЗША, дзеючая на сёння Канвенцыя 1956 года, на жаль, не прадугледжвае абавязковай працэдуры прызнання судовых рашэнняў па спагнанні аліментаў, вынесеных у нашай краіне, на тэрыторыі іншых дзяржаў.

Канвенцыя 2007 года, якая цяпер запрацуе і ў нас, якраз і заклікана ў такіх выпадках гарантаваць абавязковую працэдуру прызнання і выканання судовага рашэння.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# КАМУ СПРЫЯЮЦЬ СУБОТНІЯ ДЫЯЛОГІ



**«Лінія выхаднога дня пашырае кола пытанняў і дае магчымасць аператыўна іх вырашаць», — лічыць намеснік старшыні Зэльвенскага райвыканкама Валянцін СЕМЯНЯКА.**

На гэты раз у тэлефонным дыялогу з жыхарамі раёна ўзнікла тэма бадзяжных сабак. На тым канцы провада жанчына выказвала занепакоенасць ростам колькасці бяздомных жывёл у аграгарадку Міжэрычы. Гэта сітуацыя дастаўляе нямала клопатаў жыхарам вёскі.

Сапраўды, праблема такая існуе, пацвердзіў Валянцін Семяняка. І абвастраецца менавіта ў зімовы перыяд, калі састарэлыя гаспадароў іх родныя забіраюць да сябе. Сабакі застаюцца без дагляду і дзічэюць. Гэта пагражае не толькі іншым свойскім жывёлам, але і людзям. Зняць пытанне на працягу тыдня даручана Каралінскаму сельвыканкаму сумесна са спецыялізаванай брыгадай раённага прадпрыемства ЖКГ.

— Не бывае такіх выхадных, каб нашы людзі не тэлефанавалі, — адзначыў Валянцін Міхайлавіч, — пытанні да ўлады заўсёды ёсць. У будны дзень не кожны мае час прыйсці ці прыехаць у райвыканкам. Асабліва з глыбінкі. Акрамя гэтага, у выхадны могуць узнікнуць сітуацыі, якія патрабуюць тэрміновых дзеянняў.

Значнае кола пытанняў датычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, вода- і цеплазабеспячэння. Падчас прамой лініі да Валянціна Семяняка паступіла скарга на недасканалую работу камунальных службаў, якія пасля замены цеплатрасы не прывялі ў належны стан агарод і агароджу. Зварот на прамую лінію даў плён — усё было прыведзена ў парадак. Не абыходзяць жыхары раёна і пытанні добраўпарадкавання агульных тэрыторый. Патэлефанаваў жыхар вёскі Чырвонае Сяло, які прасіў пасадзейнічаць у навядзенні парадку каля штучнага вадаёма ў іх населеным пункце. Як вядома, гэтымі пытаннямі павінен займацца сельскі Савет, што і было ўказана яго старшыні.

— Праблемы грамадзян бяру пад асабісты кантроль, — падкрэсліў Валянцін Семяняка. — Хоць і рэдка, але бываюць выпадкі, калі чалавек звяртаецца ў раённую службу, але яго праблема застаецца без увагі ці яе рашэнне не задавальняе. Вось і вымушаны зэльвенцы ісці да кіраўніцтва. Таму і сочым, каб спецыялісты працавалі больш аператыўна і памяталі пра галоўную задачу — дапамагчы чалавеку.

Па словах прадстаўніка выканаўчай вертыкалі, падобная мадэль узаемадзеяння з насельніцтвам дае эфект, таму што дазваляе выявіць значнае кола праблем і дэталёва іх разабрацца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Актуальнае інтэрв'ю

**Пётр АТРОШЧАНКА:**

# «КАРУПЦЫЯ Ў НАС НЕ КВІТНЕЕ...»



**Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па нацыянальнай бяспецы разгледзела на працягу апошняга года шэраг важных для абараназдольнасці краіны пытанняў. На гэтай сесіі камісія плануе прадставіць дэпутатам на разгляд два свае законапраекты — «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб барацьбе з тэрарызмам» і «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абароны дзяржаўных сакрэтаў». Першы скіраваны на ўдасканаленне механізмаў папярэджвання і спынення тэрарыстычнай дзейнасці, прывядзенне яго палажэнняў у адпаведнасць з заканадаўчымі актамі. Другі — на стварэнне ўмоў для эфектыўнага функцыянавання сістэмы абароны дзяржаўных сакрэтаў. Аб тым, якая работа была праведзена раней, пачынаючы з канца мінулага года, расказвае дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Пётр АТРОШЧАНКА.**

***— Дазвольце, Пётр Аляксеевіч, пачаць з таго, што 20 снежня Камітэт дзяржаўнай бяспекі будзе адзначаць 100-годдзе. Не так даўно вы самі служылі ў гэтым ведамстве, і для вас гэта ці не галоўнае прафесійнае свята.***

— Я маю некалькі дыпломаў, аднак каля чвэрці стагоддзя сапраўды быў афіцэрам органаў дзяржбяспекі — вы маеце рацыю. Дзень супрацоўніка органаў дзяржбяспекі адзначаецца ў нашай краіне менавіта 20 снежня, бо ў гэты дзень 1917 года Савет народных камісараў прыняў пастанову аб утварэнні Усерасійскай надзвычайнай камісіі. Яе задачай была абарона суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці нашай краіны, а таксама барацьба з антысавецкімі змовамі, разведвальна-падрыўной дзейнасцю замежных дзяржаў і шматлікімі бандамі. Пасля вайны неабходнасць у такой камісіі адпала, таму 1 сакавіка 1922 года яе назвалі галоўным палітычным упраўленнем пры Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі, а з 15 чэрвеня 1934 гэта быў ужо Народны камісарыят унутраных спраў БССР.

Дзень КДБ у першую чаргу прысвечаны ветэранам Вялікай Айчыннай. Чэкісты адыгралі велізарную ролю ў вызваленні Беларусі. Спецгрупамі НКУС таго часу былі знойдзены і абясшкоджаны 22 разведвальна-дыверсійныя школы Абвера, 36 рэзідэнтур і звыш 6,5 тысячы агентаў нямецкай разведкі. Займаўся НКУС дыверсантамі, шпіёнамі і бандыцкімі групоўкамі, якія ўзніклі з-за эканамічнага і харчовага крызісу. У дзень КДБ можна прыгадаць і геraізм каля 200 афіцэраў і прапаршчыкаў, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане...

Гэта служба патрабуе асаблівых якасцяў і рыс характару, цвёрдай веры ў сваю краіну, у справядлівасць сваёй справы, у тое, што твая Айчына — вышэй за ўсё. Органы дзяржбяспекі ёсць у кожнай дзяржаве. І сёння яны неабходны ва ўмовах войнаў інфармацыйных, эканамічных, для процістаяння тэрарыстычнай дзейнасці. Вельмі важна, каб надзейныя людзі займаліся работай, звязанай з абаронай нацыянальных інтарэсаў, суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці, канстытуцыйнага ладу, бяспекі грамадзян. Абстаноўка ў свеце сёння далёкая ад стабільнай. Расце колькасць пагроз і рызык, ігнаруюцца нормы міжнароднага права. Прымяняюцца шантаж, правакацыі, эканамічны, інфармацыйны ціск, робіцца стаўка на радыкальныя меры, на нацыяналістычныя групоўкі, не спыняюцца спробы дэстабілізацыі ўнутранай сітуацыі для таго, каб паставіць пад кантроль цэлыя краіны. Тым не менш я перакананы, што запалохаць нас ні ў кога не атрымаецца. Мы гатовыя прайсці праз гэтыя цяжкасці, даць адэкватны адказ на любыя пагрозы нашай стабільнасці і адзінству.

***— Віншуем вас з прафесійным святам і жадаем плённай працы!***

— Дзякуй вялікі! У сваю чаргу я хацеў бы павіншаваць усіх дзеючых і былых супрацоўнікаў КДБ, пажадаць усім здароўя, поспехаў і дабрабыту!

***— Завяршыўся першы год вашай дзейнасці як дэпутата, і таму хацелася б абмеркаваць некаторыя вострыя праблемы, якія аказаліся ў полі вашага зроку. У першую чаргу гэта карупцыя — асноўная пагроза нацыянальнай бяспецы...***

— Са студзеня мінулага года ў краіне дзейнічае Закон «Аб барацьбе з карупцыяй», які ўстанаўлівае прававыя асновы дзяржаўнай палітыкі ў антыкарупцыйнай барацьбе. Закон скіраваны на абарону правоў і свабод грамадзян, грамадскіх інтарэсаў ад тых пагроз, якія цягнуць за сабой праявы карупцыі. Там ідзе гаворка і аб забеспячэнні эфектыўнай дзейнасці дзяржаўных органаў, службовых асоб, абавязаных папярэджваць, выяўляць, спыняць правапарушэнні, якія ствараюць умовы для карупцыйных праяў, а таксама змагацца з іх наступствамі.

Сёлета Генеральная пракуратура і іншыя зацікаўленыя структуры прааналізавалі работу закона і выявілі некаторыя праблемныя пытанні, на вырашэнне якіх зараз звяртаецца ўвага. Шэраг канкрэтных крокаў быў намечаны на лістападаўскай міжведамаснай канферэнцыі «Прававыя і арганізацыйныя пытанні практыкі прымянення і шляхі ўдасканалення заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй», удзельнікам якой ад парламента быў менавіта я.

Для ўсведамлення маштабаў карупцыі ў нашай краіне я назаву некалькі лічбаў. За дзевяць месяцаў гэтага года ў Беларусі было выяўлена 1389 карупцыйных злачынстваў, што, дарэчы, больш, чым летась. Фактычна нязменнай сітуацыя засталася на Гродзеншчыне, а на Міншчыне і ў сталіцы намецілася тэндэнцыя да скарачэння. Аднак гаварыць аб тым, што ў нас карупцыя квітнее, я б не стаў. Усё ж такі большасць злачынстваў такога кшталту адбываецца на нізавым і сярэднім узроўнях кіравання. Асобы, якія займаюць адказнае становішча, складаюць каля двух працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто здзейсніў карупцыйныя злачынствы.

***— Даволі востра паўстала сёлета праблема, звязаная з пакараннем маладых людзей, якія мелі дачыненне да распаўсюджвання наркотыкаў. Іх блізкія і сваякі пачалі гуртавацца, каб з дапамогай СМІ падняць тэму больш лаяльнага падыходу да кожнага асобнага выпадку...***

— Звярталіся маці, сёстры і жонкі, у тым ліку і да мяне, да іншых дэпутатаў, з прапановамі аб прывядзенні заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі і прававымі нарматывамі, ратыфікаванымі нашай краінай. Павінен заўважыць, што наша заканадаўства не супярэчыць сусветнай практыцы, яно цалкам адпавядае той трывожнай сітуацыі, якая склалася. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы зараз ажыццяўляецца работа па выпрацоўцы прапаноў для карэкціроўкі крымінальнага заканадаўства ў гэтай сферы. Пасля ўнясення адпаведнага законапраекта ў Палату прадстаўнікоў ён будзе разгледжаны ва ўстаноўленым парадку.

***— Сур'ёзная праблема для нашага грамадства — смяротнае пакаранне, ад якога наша краіна, адзіная ў Еўропе, пакуль не адмаўляецца.***

— У сярэдзіне 1990-х звыш 80 працэнтаў нашага насельніцтва выказалася на рэферэндуме за такую меру пакарання. Многія людзі мала ведаюць пра гэтую тэму, не задумваюцца аб тых працэсах, якія адбываюцца. Між тым створаная сёлета пры парламенце новая рабочая група актыўна вывучала азначаную праблему. Яе мэтай не з'яўляецца перакананне ў неабходнасці адмены ці захавання смяротнага пакарання. Мы толькі інфармуем грамадзян аб тым, што гэта за тэма, каб людзі мелі больш звестак для прыняцця адэкватных рашэнняў.

У нас неаднаразова былі міжнародныя эксперты, дакладчык па Беларусі камісіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы па палітычных пытаннях і дэмакратыі Андрэа Рыгоні. Дадзеная тэма абмяркоўвалася і на пасяджэнні палітычнага камітэта Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы ў Страсбургу. Сапраўды, еўрапейцы прыводзяць статыстыку, паводле якой становіцца відавочным, што адмена смяротнага пакарання не прыводзіць да росту злачыннасці. Тым не менш сёння ў нашай краіне няма адзінага меркавання аб тым, што смяротнае пакаранне трэба адмяніць. Працэнт беларусаў, якія выступаюць за захаванне такой практыкі, пакуль вышэйшы. Пазіцыя нашай рабочай групы такая, што да таго як праводзіць парламенцкія слуханні па гэтым пытанні, неабходна сур'ёзна папрацаваць з грамадскай думкай.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Гэта абмяркоўвалі на з'ездзе вучоных

# ЯК ПАБУДАВАЦЬ ГРАМАДСТВА ВЫСАКАРОДНЫХ, ШЧАСЛІВЫХ І ПАСПЯХОВЫХ ЛЮДЗЕЙ?

**«Вынікі навуковых даследаванняў грамадазнаўча-гуманітарных навук не прыносяць імгненных змен і эканамічнай выгады. Пры гэтым даследаванні гуманітарыяў з'яўляюцца вызначальнымі для грамадскага развіцця, спрыяюць умацаванню нацыянальнай і канфесійнай згоды грамадства, яго кансалідацыі, фарміруюць патрыятычныя і грамадзянскія якасці падрастаючага пакалення. Многія няпростыя праблемы, якія ставіць жыццё штодня, знаходзяцца ў плоскасці адказнасці і вырашэння менавіта гуманітарных навук, і менавіта мы, гуманітарыі, абавязаны праяўляць штодзённы клопат і нават актыўна адстойваць этычнае рэгуляванне навукі», — такую думку выказаў у сваім выступленні на ІІ з'ездзе вучоных у рамках тэматычнай секцыі акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр КАВАЛЕНЯ.**



Ён звярнуў увагу на наступную акалічнасць: сёння паўсюдна падкрэсліваецца, што грамадзянска-патрыятычнае выхаванне навучэнца з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў сучаснай школы. Але для таго каб выхаваць чалавека творчага і таленавітага, які любіць свой народ, сваю радзіму, сапраўднага грамадзяніна, неабходна стварыць эфектыўную сістэму выхаваўчай работы, накіраваную на фарміраванне гарманічнай, рознабаковай і высокамаральнай асобы.

— Хачу падкрэсліць, што толькі лозунгамі, заклікамі і аднаразовымі мерапрыемствамі гэту праблему не вырашыць — патрабуецца вялікая навуковая псіхолага-педагагічная работа. Аднак сёння вучэбна-выхаваўчы працэс знаходзіцца ў палоне метадычных традыцый сярэдзіны ХХ стагоддзя, хоць свет змяніўся. Навукова-тэхнічны прагрэс стварыў магчымасці для абнаўленай арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы — як у школе, так і ў сістэме вышэйшай адукацыі. Некаторым не хочацца ўзнімаць гэтае пытанне. Мой вопыт педагагічнай працы дазваляе сцвярджаць, што добра арганізаваны працэс гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў — гэта не толькі найважнейшая ўмова паспяховага вырашэння ў ВНУ задач прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў, але і, што асабліва важна, выхавання маральных якасцяў будучых настаўнікаў і медыкаў, мастакоў і музыкантаў, інжынераў і навукоўцаў, — падкрэсліў вучоны. — Важна пастаянна шукаць дзейсныя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, рыхтаваць вучэбна-метадычныя распрацоўкі, якія адпавядаюць сучаснаму ўзроўню развіцця грамадства і навукі.

Нас не могуць не хваляваць праблемы падрыхтоўкі кадраў, звязаныя з празмерным захапленнем у адукацыйным працэсе інфармацыйнымі тэхналогіямі. Заўважана, што ў многіх студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў зніжаецца памяць і ўспрыманне вуснай і пісьмовай інфармацыі. Небяспека заключаецца ў тым, што моладзь не прывучана думаць і разважаць, а проста шукае адказы ў «Вікіпедыі». Я ўпэўнены, што ў гэтым няма віны інфармацыйных тэхналогій. Гэта яскравае сведчанне нашай непадрыхтаванасці да навукова-тэхнічнага прагрэсу і пацвярджэнне таго факта, што навукова-тэхнічнае развіццё значна апярэджвае духоўна-культурнае. Навуковай супольнасці, асабліва філосафам, псіхолагам, педагогам, небходна неадкладна заняцца навукова-пошукавай распрацоўкай методык выкладання дысцыплін ва ўмовах інфармацыйнага выбуху.

Аляксандр Каваленя з сумам канстатаваў зніжэнне грамадскай цікавасці да гуманітарыстыкі. У краінах Захаду ўжо гавораць пра «крызіс гуманітарных навук». У ЗША ўсяго 7% ад агульнай колькасці студэнтаў выбіраюць гуманітарныя навукі. Гэта ўдвая менш, чым у 1970-я. Пры гэтым 60% кіраўнікоў амерыканскіх кампаній (з 652 апытаных) маюць гуманітарныя дыпломы. У Вялікабрытаніі з 650 членаў парламента 65% атрымалі адукацыю ў галіне гуманітарных і сацыяльных навук. Паводле апытанняў заходніх работадаўцаў, вышэй за ўсё яны цэняць у выпускнікоў універсітэтаў якасці, якія фарміруюцца дзякуючы гуманітарным дысцыплінам: 89% — эфектыўная вусная і пісьмовая камунікацыя; 81% — крытычнае мысленне і аналітычны склад розуму; 75% — уменне звязаць прафесійныя праблемы з этычнымі.

У стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040» удзяляецца значная ўвага развіццю навукі хуткімі тэмпамі, паколькі з'яўляюцца новыя распрацоўкі ў сферы ІТ, штучнага інтэлекту, робататэхнікі, і засваенню гуманітарных ведаў як аднаго з найважнейшых складнікаў развіцця грамадства.

— Зразумела, калі мы не хочам адставаць ад вядучых навуковых школ, неабходна прыкладаць намаганні не толькі для падтрымання, але і для нарошчвання інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі, — упэўнены кіраўнік аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Акадэміі навук. — У гэтым плане асаблівай увагі заслугоўваюць узровень і якасць нацыянальнай сістэмы адукацыі, падрыхтоўка навуковых кадраў, колькасць навуковых работнікаў, якія ажыццяўляюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі. Для нашай краіны, якая не валодае багаццем прыродна-паліўных рэсурсаў, гэта не толькі аснова яе паспяховага канкурэнтнага развіцця, але і падмурак для ўмацавання духоўна-культурнай, сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сферы беларускага грамадства. Тым больш, што беларускі народ варты дабрабыту, які мы абавязаны стварыць уласнымі намаганнямі пры пастаяннай падтрымцы з боку навукі. Нам не патрэбна роўнасць галечы. Для нас важна пабудаваць грамадства высакародных, добрых, шчаслівых і паспяховых людзей. Менавіта гэтую ідэю мы абавязаны ўкараняць у свядомасць падрастаючага пакалення, пачынаючы з дашкольнага ўзросту і праводзіць яе праз усё жыццё. Навуковыя даследаванні гуманітарыяў павінны дапамагчы беларускаму народу пазбавіцца ад пачуцця непаўнавартасці «пана сахі і касы», якое стагоддзямі ўкаранялася ў грамадскую свядомасць. Вучоныя-гуманітарыі абавязаны дэманстраваць самім сабе і ўсяму грамадству, што беларусы — высакародны, самадастатковы, таленавіты, высокакультурны народ, здольны пабудаваць багатую і суверэнную Рэспубліку Беларусь.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Ісламскія краіны заявілі аб прызнанні Усходняга Іерусаліма сталіцай Палесціны



Краіны, якія ўваходзяць у Арганізацыю ісламскага супрацоўніцтва (АІС), прызналі Усходні Іерусалім сталіцай Палесціны. Пра гэта паведамляе інфармацыйнае агенцтва Anadolu са спасылкай на заяву АІС.

«Мы аб'яўляем, што прызнаём Палесцінскую дзяржаву, сталіцай якой з'яўляецца Усходні Іерусалім», — гаворыцца ў тэксце Стамбульскай дэкларацыі, прынятай па выніках пазачарговага саміту АІС у Стамбуле.

Арганізацыя таксама заклікае сусветную супольнасць прызнаць Усходні Іерусалім акупаванай сталіцай Палесцінскай дзяржавы. «Краіны АІС самым рашучым чынам асуджаюць і не прымаюць рашэнне прэзідэнта ЗША Дональда Трампа па Іерусаліме», — адзначаецца ў тэксце дэкларацыі.

Раней аб неабходнасці прызнаць Іерусалім сталіцай «акупаванай дзяржавы Палесціны» ў адказ на прызнанне гэтага горада прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам сталіцай Ізраіля заявіў прэзідэнт Турцыі Эрдаган.

### Японскі суд адхіліў іск грамадзян Кітая ў сувязі з агрэсіяй Токіа ў 30-я гады

Найвышэйшы суд Токіа адхіліў у чацвер апеляцыю 240 грамадзян КНР, якія спрабуюць дамагчыся ад урада Японіі выбачэнняў і кампенсацый за гібель сваякоў падчас японскай агрэсіі ў Кітаі ў 30-х гадах мінулага стагоддзя. У 2015 годзе іх іск быў адхілены такійскім судом першай інстанцыі.

Грамадзяне Кітая прадставілі дакументы аб тым, што іх сваякі загінулі ў 1938 годзе падчас масіраваных японскіх паветраных бамбардзіровак горада Чунцын і яго ваколіц, што былі ў той час галоўным апорным пунктам кітайскага ўрада на чале з лідарам партыі Гаміньдан Чан Кайшы. Яго армія вяла жорсткія баі з акупантамі. Істцы сцвярджаюць, што масіраваныя бамбардзіроўкі безабароннага горада — гэта ваенная злачынства, якое парушае міжнародныя правы. Акрамя выбачэнняў ад Токіа, яны патрабуюць кампенсацый на агульную суму 1,8 млрд ен (каля $16 млн).

Японскі суд прызнае шкоду, нанесеную бамбардзіроўкамі грамадзянскаму насельніцтву. Аднак, на яго думку, міжнародныя правы і японскае заканадаўства не даюць істцам права патрабаваць кампенсацый за падзеі амаль васьмідзесяцігадовай даўніны.

### СМІ: Пуцін здымаўся на «Ленфільме» ў 1970-х як каскадзёр

У 1970-х гадах Уладзімір Пуцін зняўся ў некалькіх карцінах «Ленфільма» ў якасці каскадзёра, паведаміў тэлеканал «Дождь» са спасылкай на калег Пуціна па здымачнай пляцоўцы. Пуцін здымаўся ў кіно разам са сваім таварышам Аркадзем Ратэнбергам, з якім яны пазнаёміліся ў секцыі самба (пасля — дзюдо) трэнера Анатоля Рахліна. І Пуцін, і Ратэнберг сталі майстрамі спорту, разам удзельнічалі ў спаборніцтвах.

Як расказаў «Дождю» былы дэпутат Дзярждумы, прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі самба Васіль Шастакоў, Пуцін здымаўся ў якасці каскадзёра ў фільме «Іжорскі батальён». «Мы здымаліся з ім і ў карціне «Блакада», і ў «Іжорскім батальёне», — расказаў Шастакоў. Паводле яго слоў, быў і трэці фільм, у здымках якога яны з Пуціным прымалі ўдзел, але Шастакоў не змог успомніць назву карціны.

«Нам было ўсё роўна, каго іграць, — кажа ён. — Нам за гэта грошы вельмі добрыя плацілі на тыя часы. Мы студэнтамі былі, а маглі, напрыклад, пайсці ў рэстаран «Каўказскі». У мяне заробак інжынера быў — 110 рублёў, то, калі ішлі здымкі, я ў дзень атрымліваў 75 рублёў. Гэта такія былі прыстойныя грошы», — растлумачыў Шастакоў.

## Выходзьце на сувязь з уладай

**16 снежня на традыцыйных прамых лініях у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме, якія штотыдзень праходзяць па суботах з 9.00 да 12.00, на звароты і пытанні грамадзян будуць адказваць:**

старшыня БРЭСЦКАГА абласнога Савета дэпутатаў Сяргей Дзмітрыевіч АШМЯНЦАЎ. Тэл. 8-016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСТНЁЎ. Тэл. 8-021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Андрэевіч ДВОРНІК. Тэл. 8-023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8-015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Уладзімір Віктаравіч ДАМАНЕЎСКІ. Тэл. 8-022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Іван Эдуардавіч ЛІПНІЦКІ. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8-017 222 44 44.

■ Чулі?!

## Азаранка вяртаецца на вялікія корты

### Беларуская тэнісістка атрымала спецыяльнае запрашэнне згуляць на Australian Open

**Нагадаем, пасля нараджэння сына Вікторыя ўжо выходзіла на корт і згуляла некалькі турніраў, але потым зноў спыніла свае выступленні ў сувязі з праблемамі сямейнага характару.**



**Пасля перамогі на Australian Open-2013.**

Дырэктар Адкрытага чэмпіяната Аўстраліі па тэнісе Крэйг Цілі адзначыў, што ў Азаранкі складаная сітуацыя, звязаная з праблемамі па апецы над сынам, таму арганізатары вырашылі аказаць ёй падтрымку, прапанаваўшы wild card. Такім чынам, Вікторыя зможа выступіць у ліку 128 удзельніц асноўнай сеткі спаборніцтваў.

Тэнісістка ў сваю чаргу падзякавала аргкамітэту Australian Open за запрашэнне і сказала, што вельмі чакае вяртання на корты Мельбурна, дзе яна двойчы запар, у 2012 і 2013 гадах, станавілася чэмпіёнкай. Вікторыя таксама адзначыла, што Australian Open з'яўляецца адным з яе любімых турніраў.

Нагадаем, Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе пройдзе 15—28 студзеня. Яго агульны прызавы фонд складзе $42,8 млн, пераможцы ў адзіночных разрадах у жанчын і мужчын атрымаюць па $4 млн.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

## І ВОСЬ ЗІМА

### Сіноптыкі абяцаюць маразы ў аўторак

**А ў бліжэйшыя суткі тэрыторыя Беларусі зноў апынецца пад уплывам атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу ўначы надвор'е ў краіне будуць па-ранейшаму фарміраваць франтальныя падзелы. Таму ў многіх раёнах дзяржавы прагназуюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, удзень франты пакінуць тэрыторыю Беларусі, але ў асобных раёнах без кароткачасовых ападкаў не абыдзецца. Месцамі чакаецца галалёд, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад мінус 2 да 4 градусаў. У нядзелю ў асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. Месцамі на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да мінус 6 градусаў, удзень будзе ад 3 градусаў нiжэй за нуль да 2 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у першай палове наступнага тыдня ў краіне надвор'е будуць фарміраваць халодныя няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступаюць з поўначы Еўропы. Таму тэмпературны фон панізіцца і наблізіцца да кліматычнай нормы. У панядзелак месцамі пройдзе кароткачасовы снег. У асобных раёнах чакаюцца слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да мінус 6 градусаў, пры праясненнях паветра астудзіцца да 8 марозу, днём тэмпература складзе ад мінус 4 да плюс 1 градуса. У аўторак месцамі прагназуецца кароткачасовы снег, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе мінус 2—7 градусаў, пры праясненнях панізіцца да мінус 10 градусаў, удзень — ад 0 да мінус 5.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Навумчык Але Аляксандраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# МІСІЯ: ДАЖЫЦЬ ДА ВЯСНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зразумела, усе мы хочам атрымаць якасны прадукт, але тэмпература і ўмовы ў магазінах розняцца. І вучоныя вызначаюць так званы астаткавы эфект — гэта колькасць дзён, якія яблык пэўнага сорту зможа пратрымацца пасля таго, як паступіць на рэалізацыю.



Многае залежыць і ад упакоўкі. Вучоныя правяраюць, як захоўваюцца плады ў скрынях, кантэйнерах, таксама сёння яблыкі пачалі пакаваць у пакеты, у якіх пасля яны трапяць у продаж.

— Нормы, звязаныя з захаваннем яблыкаў, былі прапісаны па сартах, якія вырошчваліся яшчэ ў савецкі час. Сёння асартымент пашырыўся, з'явіліся новыя сарты, змяніўся памер пладоў, і мы вядзём работу з улікам гэтага. У інстытуце быў распрацаваны стандарт на яблыкі позніх і ранніх тэрмінаў выспявання, — расказвае **навуковы супрацоўнік аддзела захоўвання і перапрацоўкі Галіна НОВІК.** — Бачыце, што тут дзе-ніздзе сустракаюцца пацямнелыя, чорныя яблыкі. Я не магу іх проста зараз узяць і перабраць. Яны — частка навуковага доследу. Мы вывучаем хваробы і фізіялагічныя расстройствы, якія праяўляюцца ў час захоўвання. Так вызначаюцца натуральныя страты. Глядзім, якія віды гнілі на пладах. Сёння ёсць сарты, устойлівыя да такіх хвароб. З некаторымі праблемамі мы ўжо навучыліся змагацца. Напрыклад, у сорту Імант можа праявіцца горкая ямчатасць, але апрацоўка кальцыем у садзе дапамагае зняць гэту праблему.

**«Ёсць зімовыя сарты, якія здымаюцца ў тэхналагічнай ступені спеласці. Такі яблык яшчэ можа быць кіслым. У час захоўвання ён «даходзіць», павялічваецца колькасць цукраў, раскрываецца смак, водар».**

Дарэчы, так званы наліў (успомнім «наліўны яблычак») — гэта таксама фізіялагічнае расстройства, такія плады не будуць захоўвацца.

***— А ці можна садаводам-аматарам параіць, якія сарты падыходзяць для працяглага захоўвання, а што трэба з'есці ў першую чаргу?***

— Асеннія сарты можна класці толькі на кароткатэрміновае захоўванне. Так, у нас распаўсюджаны Слава пераможцам, Ауксіс, тая ж Антонаўка. Апошнюю многія аматары імкнуцца пратрымаць па максімуме, але пры гэтым смакавыя якасці пагаршаюцца, яблык становіцца рыхлым, колер і водар ужо не тыя, ды і пра карысныя якасці гаварыць не варта. Але ёсць зімовыя сарты, якія здымаюцца ў тэхналагічнай ступені спеласці. Такі яблык яшчэ можа быць кіслым. У час захоўвання ён «даходзіць», павялічваецца колькасць цукраў, раскрываецца смак, водар. Вядома, пры дапамозе спецыяльных прэпаратаў можна запаволіць працэс выспявання яблыкаў. Але сёння існуюць сарты, якія могуць ляжаць да красавіка дзякуючы сваім генетычным пакасчыкам, а не таму, што іх нечым апрацавалі. У нашым аддзеле, напрыклад, закладзены на захоўванне і мы гатовы рэалізоўваць Імант да лютага — красавіка і Надзейны (сакавіты яблык зялёнага колеру, з тонкай скуркай) да лютага — сакавіка. Дарэчы, гэтыя плады падыходзяць і для перапрацоўкі. З Іманта атрымліваецца дастаткова празрысты сок, з Надзейнага — больш мутны і кіславаты. Цудоўны сорт — Весяліна, гэтыя буйныя чырвоныя яблыкі мінімальна пашкоджваюцца паршой, незалежна ад таго, якім выдаўся год, і ляжаць да сакавіка. Аматарам салодкага варта парэкамендаваць завесці ў сябе такі сорт зімняга тэрміну выспявання, як Беларускі салодкі. Праўда, гэтыя яблыкі захоўваюцца не так доўга, парог — снежань, але яны салодкія ўвесь час, іх можна ўжываць адразу, як знялі.



***— Умовы, у якіх рос яблык, уплываюць на тое, як ён будзе захоўвацца? Напрыклад, гэты год выдаўся вільготным.***

— Плады раслі павольней, не ўсе сарты паспелі дабраць і паўнацэнна развіцца па масе, не выдалі свае максімальныя пакасчыкі. Збор пачаўся на паўтара тыдня пазней, чым звычайна. Год быў вельмі складаны, што адбілася на якасці яблыкаў, мы ўжо бачым, што ўраджай будзе горш захоўвацца, шмат страт ад фізіялагічных расстройстваў. Першая бяда, з якой сёлета сутыкнуліся, — перапад тэмператур у час цвіцення, завязвальнасць пладоў была нізкая. Далей — замаразкі, калі ўжо была завязь. З'явіліся шрамы, пацёртасці, аржаўленасць на пладах. Пасля іх пабіў моцны град, і васкавы налёт ужо не той: калі ёсць трэшчына, якая нават зажыла, — гэта як вароты для інфекцыі. У выніку — утварэнне паршы і іншага. Як бачыце, ёсць тое, што ад чалавека не залежыць.

**«Так званы наліў (успомнім «наліўны яблычак») — гэта таксама фізіялагічнае расстройства, такія плады не будуць захоўвацца».**

***— А што здольны зрабіць садавод?***

— Каб плады максімальна доўга захоўваліся, важна вызначыцца з тэрмінамі ўборкі. Калі паспяшацца, будзе моцнае ўвяданне пладоў, калі перетрымаць яблык зімовых тэрмінаў выспявання на дрэве, ён хутчэй даспее, скароціцца тэрмін захоўвання, колькасць фізіялагічных расстройстваў будзе большая, раней можа з'явіцца гніль. Каб вызначыць аптымальны час для збору пладоў, у інстытуце мы праводзім ёдакрухмальныя пробы. Садаводам-аматарам можна параіць, што самы лепшы час для масавага збору ўраджаю 1—15 верасня. Яблыкі лепш здымаць у пальчатках, каб не пашкодзіць васкавы налёт. Важна, каб не было адрыву пладаножкі, пашкоджаных, пабітых пладоў. У ідэале лепш яблыкі адразу класці ў тыя скрыні, у якіх яны будуць далей захоўвацца, перасцілаць слаі папер. Кожны сорт кладзіце асобна, ні ў якім разе яблыкі не трэба захоўваць з караняплодамі, капустай, цыбуляй.

***— Ці можна папярэдзіць хваробы, якія «вылазяць» у час захоўвання?***

— Без сродкаў хімабароны зараз у садзе немагчыма абысціся. Прычым апрацоўкі неабходна праводзіць на працягу ўсяго сезона, а апошнюю для зімовых сартоў — не пазней першай дэкады жніўня. Існуе шмат прэпаратаў хімабароны, якія прымяняюцца ў садзе і дазваляюць максімальна скараціць колькасць грыбных захворванняў на яблыках, што пагражаюць непасрэдна ў час захоўвання.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

# ПА РЭЦЭПТАХ БАБУЛЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як расказала **дырэктар навучальнай установы Ірына ШУШКЕВІЧ,** выпрабаванні кухараў — частка фестывалю беларускай культуры і літаратуры.

— А ўсё пачалося 15 гадоў таму з «Тыдня беларускай культуры». Цяпер гэта маштабны і грандыёзны фестываль. У прыватнасці, у канцы лістапада адбылося свята «Утульная хатка». У ім удзельнічалі выхаванцы і педагогі музычнай студыі. Гучалі родная мова, беларуская музыка, радавалі вочы яскравыя танцы. Потым правялі конкурс вершаў «Гучы, роднае слова!». Ён быў прысвечаны творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Правялі і конкурс малюнкаў. Паводле твораў класікаў зрабілі газеты. Праз некалькі дзён будзе паказана інсцэніроўка эпізода паэмы «Новая зямля»... Але сярод дзяцей і бацькоў самае любімае ў чарадзе шматлікіх мерапрыемстваў — свята «Беларуская кухня», — расказала яна.

Яго па традыцыі праводзяць у шосты вучэбны дзень. У выніку гэта не толькі школьнае, але і сямейнае свята.

Вось і сёлета ў сталовай школы яблыку не было дзе ўпасці. Зрэшты, яблыкі ўпрыгожылі сталы, якія ўгіналіся ад багатага выбару смачных страў. Над іх стварэннем аўтарам прыйшлося нямала папрацаваць. У час падрыхтоўкі да кулінарнага фэсту школьнікі разам з бацькамі, дзядулямі і бабулямі чыталі кнігі па гісторыі беларускіх страў. Шукалі ў выданнях і інтэрнэце рэцэпты. Складалі сямейныя меню, рабілі фотаальбомы. Па ўмовах конкурсу трэба сервіраваць сталы з выкарыстаннем твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Многія, дарэчы, зрабілі эксклюзіўныя ўпрыгажэнні самі. Нават звычайны гарбуз ператварылі ў макет ратушы — сімвал гістарычнага цэнтра горада...

На свяце кожны клас абараняў свой гасцінны куток. Спявалі беларускія песні, чыталі вершы.

— Нашы вучні, дзякуючы ўсяму гэтаму, шмат ведаюць пра беларускія традыцыі і абрады. Яны ахвотна раскажуць пра іх усім, хто цікавіцца. Мы летась удзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе школьных праектаў, дзе занялі адно з прызавых месцаў у намінацыі, якая датычыцца беларускай культуры. Задумалі зрабіць тэматычны міжнародны праект, — дзеліцца дырэктар.

У планах — заяўка на атрыманне гранта для папулярызацыі нацыянальнай кухні і культуры. Мяркуюць у перспектыве запрашаць і турыстаў — на майстар-класы. Дарэчы, вучні гэтай школы пад кіраўніцтвам педагогаў распрацавалі некалькі пешых маршрутаў.

Ды і побач з будынкам школы ёсць што паказаць. Напрыклад, стары яблыневы сад, які дае добры ўраджай ужо больш за паўстагоддзя. І дзе з дазволу кіраўніцтва школы яблыкі розных сартоў могуць браць усе ахвотныя...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*





**ОАО «Белхим», г. Минск, ул. Короля, 34 сообщает о решении наблюдательного совета ОАО «Белхим» (протокол №42 от 11.12.17 г.)** о предоставлении ОАО «Белпромтара» – участнику холдинга «Белресурсы», г. Минск, ул. Бабушкина, 22, беспроцентного займа в сумме 300 000 белорусских рублей для приобретения сырья, закупки вторсырья и оплату топливных и энергетических ресурсов сроком погашения до конца 2018 года.

УНП 100122846

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 22 декабря 2017 года проводит повторный 1-й открытый аукцион по продаже имущества

| Номера лотов | Наименование имущества | Год выпуска | Начальная цена торгов, бел. руб., в том числе НДС 20% | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Легковой автомобиль (седан) AUDI A6, идентификационный номер (VIN) WAUZZZ4F47N044724 | 2006 | 13 214,63 | 1321,46 |

**Место нахождения имущества: г. Минск, ул. Казинца, 2.**

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении РУП «Белспецконтракт».

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **22 декабря 2017 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 20 декабря 2017 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **22 декабря 2017 г.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь – в течение **10** банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.
3. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем (единственным участником) по фактическим затратам не позднее следующего дня после их проведения.
4. РУП «Белспецконтракт» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY31BLBB30120101099370001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код BLBBBY2X, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 (RUR), в Центре банковских услуг № 701, ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код BPSBBY2X, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090 Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 398 05 41, факс (017) 398 05 41.**

Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» №216 от 9 ноября 2017 г.

**РУП «Белпочта», Минский филиал объявляет о проведении переговоров** (без процедуры предварительного квалификационного отбора с улучшением предложений для переговоров) по выбору подрядной организации для выполнения строительно-монтажных и пусконаладочных работ по объекту: «Устройство системы технологического аудио-видео контроля в ОПС Ждановичи-2 МОЦПС по адресу: Минский район, п. Ждановичи, ул. Линейная, 12, ОПС-3 Столбцовского РУПС по адресу: г. Столбцы, ул. Социалистическая, 21, ОПС-4 Вилейского по адресу: г. Вилейка, ул. 17 Сентября, 30, ОПС-6 Молодечненского РУПС по адресу: г. Молодечно, ул. Притыцкого, 18, по Минской области».

**Предложения для переговоров принимаются до 09.00 22 декабря 2017 года:**

– почтой по адресу: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3 (с отметкой «в комиссию по проведению переговоров»);

– нарочным по адресу: 220039, г. Минск, ул. Воронянског, д. 5, к. 3, каб. 109 (понедельник – четверг – с 8.30 до 17.15, пятница – с 8.30 до 16.15).

Контакты для получения дополнительной информации: сектор энергетики отдела информационных технологий и технического обеспечения Минского филиала РУП «Белпочта» – тел. 264 89 88)

УНП 101120215

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Стройтрест №4» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже изолированного помещения (наименование – Кабинеты) инв. № 500/D-708148791 общей площадью 131,6 кв.м, расположенного на первом этаже многоквартирного жилого дома по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 64-155 (далее – Объект).

Начальная цена с НДС (20%) – 370 422,22 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены 37 042,00 бел. руб.) перечисляется на р/с в формате IBAN №BY55BPSB30121082600169330000, в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», BIC BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 (один) процент от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.10.2017. Аукцион состоится 22.01.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 18.01.2018 до 16.00 по указанному адресу. Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17



■ Ёсць нагода

# ЯК РАНІЦА РОБІЦЦА ДОБРАЙ




Госці часта прынасілі на праграму розныя пачастункі.

## З чаго пачыналася 20 гадоў таму адна з самых папулярных праграм беларускага тэлебачання?

**Ларыса Грыбалёва, Алесь Круглякоў, Павел Каранеўскі, Вольга Шлягер, Алег Ціткоў, Святлана Бароўская, Надзея Герасімчык, Аляксандр Аўчыннікаў, Вольга Водчыц, Дзмітрый Карась, Дарыя, Яўген Перлін, Вера Карэтнікава, Дзяніс Дудзінскі — за два дзясяткі гадоў хто толькі не жадаў тэлегледачам самага добрага, бадзёрага, цікавага і пазітыўнага ранку! Нават мне аднойчы ўдалося на паўгадзіны стаць вядучай «Добрай раніцы, Беларусь!» — разам з іншымі калегамі-газетчыкамі, у межах журналісцкага эксперымента. І гэта быў неймаверны, хвалюючы і прыемны вопыт. Папраўдзе, штодзённая трохгадзінная праца ў прамым эфіры на шматмільённую аўдыторыю — няпростае выпрабаванне на трываласць і добразычлівасць, адэкватнасць і пачуццё гумару, шчырасць і красамоўнасць, і такі тэмп вытрымае далёка не кожны.**

**Як на беларускім тэлебачанні з'явілася ўласнае ранішняе шоу, чым яно «зачапіла» аўдыторыю і з якіх прычын стала доўгажыхаром эфіру, мы распыталі аднаго са стваральнікаў праграмы, тэлежурналіста, дакументаліста Барыса ГЕРСТЭНА.**

***— Чула ад тэлевізійнікаў, што папраўдзе гісторыя ранішняга тэлешоу пачалася яшчэ раней, з запуску ў 1992-м праграмы «Ранішні кактэйль»...***

— Праўда, была такая праграма — невялікая, хвілін на 20, у якой была зарадка кшталту ўрокаў ад Наталлі Наважылавай, а ў дадатак нейкі відэасюжэт. У пэўнай ступені гэта быў прадвеснік «Добрай раніцы, Беларусь!».

А ў 1991-м я два месяцы быў у ЗША і штодня глядзеў знакамітую «Good Morning America». Вярнуўшыся, падзяліўся ўражаннямі са сваім сябрам Валодзем Ісатам (на жаль, сёння яго ўжо няма). Вельмі доўга мы абмяркоўвалі, шліфавалі ідэю — і даспелі годзе ў 96-м.

28 снежня 1997 года наша ранішняя праграма ўпершыню выйшла ў эфір. Праўда, першыя тры выпускі былі ў запісе — не памятаю дакладна чаму, мабыць, вырашылі не рызыкаваць у пераднавагодняй мітусні. Дарэчы, для нас упершыню на Беларускім тэлебачанні пабудавалі асобную студыю — па цяперашніх мерках маленькую, але тады гэта было такое неймавернае, фантастычнае шчасце! Дагэтуль памятаю, з якім трымценнем мы з Валодзем Ісатам увайшлі туды.

** Вядучым першых выпускаў «Добрай раніцы, Беларусь!» стаў... Дзед Мароз, у вобразе якога далёка не ўсе змаглі пазнаць акцёра Вілена Разенека. «Унікальны быў чалавек, — з дакладнасцю дакументаліста зазначае Барыс Герстэн, — кім ён толькі не працаваў! Мог скласці печ, выдатна сталярнічаў, цудоўна маляваў, спяваў, быў трубачом ваеннага аркестра, кіраваў цыганскім ансамблем, працаваў рэжысёрам на Беларускім тэлебачанні і служыў акцёрам у тэатры Горкага... А яшчэ ў яго было выдатнае пачуццё гумару, так што, лічу, нам пашанцавала з першым вядучым».*

— З першых дзён студзеня 1998-га і да сёння «Добрай раніцы, Беларусь!» ідзе выключна ў прамым эфіры, і гэта прынцыпова важны момант. Нездарма ў праграмы быў дэвіз «Нас — дзесяць мільёнаў», і, паводле задумкі, абсалютна кожны глядач мог патэлефанаваць у студыю, расказаць нейкую цікавую гісторыю або павіншаваць блізкіх з днём нараджэння (дарэчы, гэтыя віншаванні нас ледзь не задушылі, іх паступала проста неймаверная колькасць). Вельмі адказна падбіралі вядучых — неабходныя былі людзі з жывой рэакцыяй, эрудзіраваныя, дасціпныя, здольныя ўжо а шостай гадзіне раніцы быць у тэлестудыі, выглядаць свежымі і бадзёрымі і трымаць гутарку ў прамым эфіры. (Працоўны дзень кожнага дуэта вядучых «ДРБ» і сёння пачынаецца самае позняе а 4-й гадзіне раніцы. — **Аўт.**). Каманда ранішняй праграмы наогул заўжды была лёгкая на пад'ём у прамым і пераносным сэнсе. Алесь Шлег, які з маладзёжнай рэдакцыі перайшоў да нас, напрыклад, прыдумаў акцыю «Чыстае неба Беларусі» — мы праляцелі над краінай на ўсім, што лётае, ад ваенных знішчальнікаў да планёраў і паветраных шароў, а фінішавала акцыя тым, што ўся рэдакцыя скочыла з парашутамі — ды з такім імпэтам, што два чалавекі ногі зламалі...



А летась у праграмы з'явіліся вельмі цёплыя восеньскія прома-ролікі.

Прызнацца, мне гэта праграма наогул многае дала. Па-першае, навучыла гэткай добрай дысцыпліне, а па-другое, падарыла мноства надзвычай цікавых сустрэч. У нас абавязкова быў госць у студыі — не вядомы акцёр або спявак ці нейкі іншы прадстаўнік шоу-бізнесу, як заведзена сёння ў многіх тэлепраектах; у нас жа каго толькі ні было: і пекары, і токары, і навукоўцы, і паслы замежных дзяржаў — самае шырокае кола, якое толькі можна ўявіць.

** Як успамінае Барыс Герстэн, аднойчы ў гасцях «Добрай раніцы, Беларусь!» быў амерыканскі прафесар Франклін Рыў, які перакладаў Пушкіна з рускай мовы на англійскую і чытаў лекцыі ў БДУ. «І я раптам прыгадаў, як у 1996 годзе быў на Паралімпійскіх гульнях у Атланце і запісаў сюжэт са знакамітым акцёрам і рэжысёрам Крыстаферам Рывам, які адкрываў гэтыя Гульні, будучы паралізаваным, седзячы ў інваліднай калясцы. У перапынку, пакуль ішлі іншыя сюжэты, запытаўся ў прафесара: выканаўца ролі Супермена — ягоны цёзка па прозвішчы? «Не, — адказаў прафесар, — гэта мой сын. Але ён памёр». І мяне нібы штосьці падштурхнула: пабег у свой кабінет, дастаў касету з запісам, і мы далі кадры з Атланты ў эфір. Больш за дзесяць гадоў ужо прайшло, але рэакцыю прафесара і мора званкоў ад гледачоў я памятаю дагэтуль. І вось такіх адкрыццяў, зробленых знянацку, у нас было вельмі многа».*



31 снежня 2007 года. Памятаеце вядучую «ДРБ» Святлану БАРОЎСКУЮ ў вобразе Чараўніцы Зімы?

***— Сёння на тэлебачанні якую праграму ні здымі, абавязкова знойдзецца, за што пакрытыкаваць. Памятаеце, якой была рэакцыя гледачоў на «Добрай раніцы» 20 гадоў таму?***

— На дзіва цёплай і прыязнай. Можа, адзін раз за шмат гадоў майго ранішняга дзяжурства на тэлефоне раздалася лаянка. Наогул, гледачы заўжды былі нашымі добрымі памочнікамі, часта задавалі такія пытанні гасцям, пра якія мы, журналісты, проста не даўмеліся б. А з якой ахвотай удзельнічалі ў конкурсах, віктарынах, фотамарафонах! Сёння гэтыя конкурсы дзякуючы сацыяльным сеткам праходзяць больш хутка, але затое ў час, калі мы іх толькі пачыналі, была надзвычайная масавасць. Уявіце: у конкурсе дзіцячага фота «Усмешка сябра», распачатым дзіцячай рэдакцыяй, удзельнічала больш за 80 дзіцячых фотастудый з усяго Савецкага Саюза, ад Махачкалы да Кішынёва, ад Кіева да Сахаліна. Потым фотамарафон быў падхоплены «Добрай раніцай», ды так і прыжыўся.

...Сёння наўрад ці ўдалося б паўтарыць той поспех — беларускіх тэлеканалаў стала болей, і яны працуюць на адной і той жа інфармацыйнай пляцоўцы. Але тады апантаная каманда змагла даць вельмі добры старт, задаць планку.

***— Былі і эксперыменты, якія сталі традыцыяй, — вандроўка студыі «Добрай раніцы» на «Славянскі базар у Віцебску», напрыклад.***

— Так, першы выхад «Славянскага базару» ў прамым эфіры здзейсніла менавіта наша праграма. Для яе афармлялі сваю міні-студыю на Віцебскім тэлебачанні, і Вольга Ганчарык са Святланай Бароўскай рабілі прамыя ўключэнні. Цяпер гэта, на мой погляд, ужо стала неад'емнай часткай фестывалю. Яшчэ адно новаўвядзенне, якое стала фішкай праграмы, — рубрыка «Ранішні госць»: скажам, калі ўчора позна ўвечары скончыўся міжнародны фестываль «Малады балет», то сёння зранку яго крыху заспаны пераможца — у студыі «Добрай раніцы» з першых вуснаў агучвае свежыя навіны пра конкурс.

** Творчая каманда «ДРБ» заўжды адказна рыхтавалася да першакрасавіцкіх выпускаў — мабыць, таму жарты выходзілі асабліва пераканаўчымі. Аднойчы, напрыклад, вядучыя абвясцілі, што мінскі завод «Крышталь» пачынае выпускаць тэкілу і прымае ад насельніцтва кактусы. Дзясяткі мінчан прыехалі да прахадной са сваімі калючымі гадаванцамі, кіраўніцтва завода ў паніцы тэлефанавала на тэлебачанне і рэжысёра праграмы ледзь не звольнілі — але, адсмяяўшыся, усё ж даравалі.*

***— Прамы эфір — гэта не толькі добра адрэпеціраваная імправізацыя, але і штодзённыя неспадзяванкі. Вам якія асабліва запомніліся?***

— Неяк быў моцны галалёд, і нават пры наяўнасці дзвюх машын вядучыя не змаглі дабрацца да студыі ў час. А я жыў побач з тэлекампаніяй. І вось а шостай раніцы гледачы бачаць карцінку: у кадры сядзіць заспаны незнаёмы чалавек і тлумачыць, маўляў, не палохайцеся, вашы любімыя вядучыя, магчыма, сёння ўсё ж даедуць, а пакуль мы пакажам свежыя навіны і цікавыя сюжэты.

***— Праз 20 гадоў, працуючы ўжо на іншым канале, ці глядзіце «Добрай раніцы, Беларусь»?***

— Я пераключаю розныя каналы, так што бачу і тое, што робіць цяперашні калектыў праграмы. Многае падабаецца — у прыватнасці, практычна ва ўсіх добрая прафесійная манера вядзення. Нешта раіць — напэўна, не трэба, бо ў кожнага тэлевізійніка сваё бачанне і сваё мысленне. Я, напрыклад, вельмі люблю гістарычныя рубрыкі і з цікавасцю гляджу найперш іх.

***— Барыс Ізідоравіч, гэты год для вас спрэс юбілейны: уласнае 70-годдзе, 50 гадоў у журналістыцы, 40 гадоў на тэлебачанні, 20 — з часу стварэння «Добрай раніцы, Беларусь!». Ці ёсць адчуванне чарговай перагорнутай старонкі і новыя планы?***

— Планаў і ідэй, сюжэтаў і прыдумак хапае, паспявай толькі ажыццяўляць. Я заўжды баюся спыніцца: такое адчуванне, што калі раптам стану, то вельмі хутка «адкінуся». Вельмі чакаю запуску на АНТ гістарычнай рубрыкі «Легенды беларускага бізнесу». Чацвёртую частку «Хронік мінскага гета» плануем дарабіць — у Германіі, Аўстрыі ўжо здымалі, можа, у Чэхіі здымем некаторыя сюжэты. Кнігу вось хачу яшчэ дапрацаваць і выпусціць (зборнік апавяданняў Барыса Герстэна «Час да і пасля» сабраў добрыя водгукі чытачоў і крытыкаў. — **Аўт.**), бо ёсць пра што расказаць. Натуральна, на такія авантюрныя праекты, як праляцець над Беларуссю на паветраным шары, я ўжо наўрад ці вырашуся, але хто ведае?

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіваў Белтэлерадыёкампаніі**

***P. S.*** *28 снежня «Добрай раніцы, Беларусь!» рыхтуе адмысловы святочны выпуск, у якім плануецца аб'яднаць вядучых розных гадоў, стваральнікаў праекта і сучасную каманду праграмы.*

**«ЗВЯЗДОЎСКІЯ» ПАДАРУНКІ ДЛЯ ВАШЫХ ПАЧАСТУНКАЎ!»**

Калі вы падпісаліся на «Звязду» на I квартал або на I паўгоддзе 2018 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2018 года на адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 17 студзеня 2018 года будуць разыграны 7 мікрахвалевых печак Horizont, а таксама суперпрыз — газавая пліта Gefest. Вынікі розыгрышу прызоў будуць апублікаваны да 27 студзеня 2018 года ў газеце «Звязда». Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 сакавіка 2018 года. Пасля гэтай даты выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на I квартал ці I паўгоддзе 2018 года.

Тэрмін правядзення рэкламнай гульні — з 1 снежня 2017 года па 31 сакавіка 2018 года. Умовы апублікаваны ў нумары 231 ад 30 лістапада 2017 года.

Даведкі па тэлефонах: (017) 337 44 04, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3164 ад 28.11.2017 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.



Horizont 20MW700—1378AAW



ПЛІТА ГАЗАВАЯ GEFEST 5100-02 T2 K

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ______________________________
(аддзяленне сувязі)
на I квартал або I паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ______________________________

Удачы ў розыгрышы!

## Аўторак, 19 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.25** Зона Х (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Жэмчугі» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.45** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.45, 15.25 Серыял «Райскае месца» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**0.05** «Сфера інтарэсаў».
**1.00** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.00** «Тэлебарометр».
**9.05, 17.05 Серыял «Жанчына ў чорным» (16+).**
**11.00, 22.05** «Багіня шопінгу» (16+).
**12.05, 21.10** «Тата зможа?» (16+).
**12.55, 19.05** «Амерыканскі жаніх» (16+).
**14.05** «Бітва салонаў» (16+).
**15.15, 23.10 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.15, 0.05** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20, 0.10** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**20.15** «Паненка-сялянка» (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бульбяныя камякі і смажаная свініна.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 23.10** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Зімняя вішня». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**9.20, 17.55** «Апошні дзень». Валерый Залатухін (12+).
**10.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці саліста оперы, народнага артыста Беларусі Юрыя Бастрыкава.
**10.25 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. «Смяротны водар» (16+).**
**12.20** «Старыя казкі».
**12.45** «Паглыбленне. Уладзімір Гасцюхін». Дак. фільм.
**13.45** «Бумеранг». Дак. фільм (12+).
**14.05 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).**
**15.40 «Скарына. Дзеля Бога і людзей». Фільм першы.**
**16.05, 21.05** «Дзяржаўная граніца». «Кур'еры страху» (12+).
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.15** «Беларуская кухня». Верашчака.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Песні пад гітару».

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Суонсі».
**9.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель».
**11.50, 13.55** Спорт-мікс.
**12.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**12.55** Піт-стоп.
**13.25** Гульні «навырост».
**14.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Ансі. Спрынт. Жанчыны.
**15.30** Хакей. Таварыскі матч. Беларусь — Казахстан.
**17.30** Легенды спорту. Беларускія гісторыі.
**18.00** Спорт-кадр.
**18.35** «Кубак вайны і свету. Пралог». Дак. фільм.
**19.20** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.50** Спорт-цэнтр.
**22.00** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** «Нашы навіны».
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** Ток-шоу «Наша жыццё».
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Спартклуб» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** Час.
**21.05 «Берагчы і абараняць». Фільм 1-ы (16+).**
**21.55 Серыял «Сярэбраны бор» (16+).**
**23.45** Начныя навіны.
**0.00** «Час пакажа» (16+).

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30 «Усё, што нам трэба...» Серыял. 1-я і 2-я серыі (12+).**
**10.40, 23.25 «Настаўнікі». Серыял (16+).**
**12.35** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Маст. фільм «Сляды на вадзе». (16+).**
**15.45** «Вадзіць па-руску!» (16+).
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**17.25** «Міншчына».
**17.35 «Разведчыцы». Серыял (16+).**
**18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Клуб першых жонак». (12+).**
**22.05** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05** «Аўтапанарама» (12+).
**1.05** Гурт «Duran Duran»: канцэрт «Крышталь розуму» (16+).

### МІР

**6.30** М/ф (6+).
**7.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**7.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00, 13.15, 19.20 Серыял «Даішнікі» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00** «Справы сямейныя» (16+).
**15.00, 3.20** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 17.10, 18.05 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**23.30 Маст. фільм «Адчыніце, Дзед Мароз» (12+).**
**1.30 Маст. фільм «Дакрануцца да неба» (16+).**
**4.15 Серыял «Мафіёза». (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40, 22.30, 23.10 Серыял «Тайны следства-17». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.35 Серыял «Прынцып Хабарава». (16+).**
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**0.30** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.05** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.15** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**
**11.00 Серыял «Сведкі». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «ППС». (16+).**
**16.35 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**19.40 Серыял «Ленінград-46». (16+).**
**23.35** «Вынікі дня».
**0.05 Серыял «Версія». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.00, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 16.05** Для дзяцей «Адказвайка».
**7.30** «Раніца на восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**11.00 Камедыя «Паездка ў Амерыку».**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.30 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонса».**
**16.10** «Мультпарад»: «Аленяня Рудольф».
**17.30 Камедыя «Дзевяць жыццяў».**
**18.55 Серыял «Давяраю табе».**
**19.50 Серыял «Свой сярод чужых».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Меладрама «Калядная ноч у Барселоне».**
**23.05 Серыял «Камісар Рэкс».**

### ВТБ

**06.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.50** М/ф «Маша і Мядзведзь». (6+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
**10.40** Баявік «Параграф 78». (16+).
**12.20** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**13.00, 19.00** Серыял «Псіхалагіні». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Атэль «Элеон». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Баявік «Параграф 78: фільм другі». (16+).
**0.00** Серыял «Васьмідзесятыя». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Ава Гарднер.
**7.05, 2.25** «Свяціцель Мікалай. Каб смутак ператварыўся ў радасць». Дак. фільм.
**7.35, 21.10** «Правілы жыцця».
**8.05, 22.50** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**8.55** «Звонавая прафесія. Званары». Дак. фільм.
**9.15** «Мхатчыкі. Тэатр часоў Алега Яфрэмава».
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 18.05** «Назіральнік».
**11.10, 1.25** XX стагоддзе. «М. С. Хрушчоў у Амерыцы». Дак. фільм.
**12.20** «Майстэрня архітэктуры». Пра бачанне.
**12.50** «Саці. Нясумная класіка...»
**13.35** «Тайны каралеўскага замка Шамбор». Дак. фільм.
**14.30, 22.20** «Палацы падарваць і сыходзіць...»
**15.10** Юбілей Маскоўскага міжнароднага Дома музыкі. Юбілейны канцэрт Уладзіміра Співакова.
**17.20** «2 Вернік 2».
**19.00, 0.15** Урокі рускай. Чытанні. К. Паустоўскі. «Тэлеграма». Чытае Сяргей Гармаш.
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Ступені цывілізацыі. «Карл Вялікі». Дак. фільм. 1-я серыя.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** Штучны адбор.
**23.45** «Pro memoria». «Азы і Узы».
**0.45** «Тым часам».

### Настальгія

**6.00** «Вакол смеху». 1980 год (12+).
**7.20, 11.10, 13.05, 14.40, 15.40, 17.00, 18.45, 20.40, 21.40, 23.00, 5.15** Музычная настальгія (12+).
**7.55** Праграма «Мантаж». 1988 год (16+).
**8.50** М/ф «У сінім моры, у белай пене». (12+).
**9.00** Маст. фільм «Кропка вяртання». (16+).
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ролінг Стоўнз». 2005 год (18+).
**13.30, 19.30** Маст. фільм «Капітан Нэма». (16+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Самадзейнасць Краіны Саветаў». 2007 год (12+).
**20.50** «Прэс-экспрэс». 1994 год (16+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 4-я частка. 2009 год (16+).
**0.45** Фільм-канцэрт «Гэта было, было...» Танцавальныя рытмы 60-х гадоў (12+).
**1.05** «Што? Дзе? Калі?» Другі паўфінал. 1982 год (12+).
**2.15** «У гасцях у М. Магамаева». «Фрэнк Сінатра». 1992 год (16+).
**3.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Бабулі напалам сказалі». (16+).

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 18.30, 1.35** Снукер. Scottish Open. Фінал.
**5.00, 0.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**6.30, 10.00, 13.30, 16.30, 18.00** Біятлон. Кубак свету.
**9.00, 11.35, 14.30, 23.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**10.30** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**17.00** Футбол. «ФІФА».
**20.00** Конны спорт. Кубак свету.
**22.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**22.30** Watts. Топ-10.
**23.00, 1.00** Аўтагонкі. Серыя WTCC.

### Кінакамедыя

**1.05** Камедыя «Настаўнік года». (16+).
**3.20** Камедыя «Небывальшчына». (12+).
**4.50** Камедыя «Прыкінься маім мужам». (16+).
**6.40** Камедыя «Усё магу». (16+).
**8.20** Камедыя «Да чорта на рогі». (16+).
**10.00** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2». (16+).
**12.00** Прыгоды «Ягуар». (16+).
**14.00** Драма «Паляўнічы на тыгра». (16+).
**15.45** Камедыя «Турэцкая для пачаткоўцаў». (16+).
**17.45** Камедыя «Рымскія спатканні». (16+).
**19.30** Камедыя «Вячэра з прыдуркам». (12+).
**21.00** Камедыя «Усё пуцём!» (16+).
**22.45** Меладрама «Якая ты прыгожая». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.25** «Доктар І...» (16+).
**7.55** «Трэндзі» (16+).
**8.25, 19.00, 2.25** «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
**10.05, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.40, 18.00** «Сляпая» (12+).
**12.35, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**13.45** «Паралельны свет» (12+).
**14.45** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.20** «Здзелка» (16+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**20.50** «Тайныя знакі. Зніклыя знакамітасці» (16+).
**21.50** «Рэвізора» (16+).
**23.15, 5.30** «Гісторыі выратавання» (16+).
**23.45** «Візіцёры». Серыял (16+).
**0.30** «Іншы свет». Фэнтэзі (18+).

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Ужо хто б казаў (12+).
**8.10** Дасканалы свет (16+).
**10.55** Далёка-далёка (12+).
**13.40** Малавіта (16+).
**15.55** Барвовыя рэкі (16+).
**20.10** Аднакласнікі (16+).
**22.10** Блакітная лагуна (16+).
**0.10** Мабільнік (18+).
**2.05** Яна яго абажае (16+).
**3.50** Легенды восені (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Сухадол (16+).
**8.20** Ведзьма (16+).
**10.20** Майстэрства жыць у Адэсе (16+).
**12.30** Рызыка (6+).
**14.30** Прагулка (12+).
**16.20, 4.20** Тры дарогі. 3—4-я серыі (12+).
**18.15** Час пік (16+).
**20.20** Блокбастар (12+).
**22.00** Трымай удар, дзетка (12+).
**0.05** Дзённік яго жонкі (16+).
**2.15** Дзень выбараў (16+).

### National Geographic

**6.00** Займальная навука. (12+).
**6.50, 18.00, 21.00, 0.45, 3.50, 5.20** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.35** Сапраўдны суперкар. (12+).
**8.20** Ледзяная дарога. (12+).
**9.05** Фатальны пажар на «Тытаніку» (12+).
**9.50** Мегазаводы. (12+).
**10.40** Шаша праз пекла. (16+).
**11.25, 17.15, 20.15** Аўта-SOS. (12+).
**12.10** Праз мільён гадоў. (12+).
**12.55** Узлом Сістэмы. (16+).
**14.25** Пагоня за леднікамі (12+).
**15.40** Доўгая дарога дадому. (16+).
**16.25, 19.30, 0.00, 2.20** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.45, 22.30** Космас: прастора і час. (12+).
**21.45, 1.30, 4.35** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас. (16+).
**23.15** Паранармальнае. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00, 13.30** У пагоні за класікай. (12+).
**14.00, 6.45** Голыя і напалоханыя. (16+).
**18.00, 5.30** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00, 2.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Мільёны Пабла Эскабара. (16+).
**0.00** Мяцеж. (16+).
**1.00** Самагоншчыкі. (16+).




# Няма шаршаткі на такую лёху

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды».**
**Ці ведалі вы, што:**

**шарша́тка —** тоўстая і доўгая іголка;

**няўломак —** чалавек моцнага целаскладу *(«Ён невысок, не надта ёмак, ды карчавіты і няўломак», — пісаў Якуб Колас пра дзядзьку Антося ў паэме «Новая зямля»);*

**сага́н —** чыгунны гаршчок *(«Маці на стол высыпала бульбы гару з сагана́» — гэта радкі Максіма Танка);*

**ёўня —** збудаванне для сушкі снапоў *(ови́н — у расіян, ёўня — ва ўкраінцаў і беларусаў);*

**цыду́лка —** маленькая запіска, пісулька *(дарэчы, слова «цыдулка» лацінскага паходжання і прыйшло да нас праз польскую мову);*

**лёха —** шчыліна, дзірка ў нечым;

**рабіць пагоду —** быць галоўным у нечым, выконваць самую істотную ролю ў чым-небудзь *(беларусы яшчэ скажуць: весці рэй, задаваць тон, іграць першую скрыпку; рускія: командовать парадом);*

**рад не рад —** насуперак свайму жаданню, незалежна ад старання, волі каго-небудзь *(беларускія сінонімы: хочаш — не хочаш, хоцькі-няхоцькі; рускі: волей-неволей).*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## Тэлесеткі

# Глядзець. Помніць.



**Цыкл дакументальных фільмаў «Тварам да твару», зняты тэлеканалам «Беларусь 24», з перамогай вярнуўся з IX Міжнароднага фестывалю ваенна-патрыятычных фільмаў і праграм «Вечны агонь», які праходзіў сёлета ў Валгаградзе да 75-годдзя Сталінградскай бітвы.**

У 9 намінацыях конкурсу ўдзельнічалі больш як 260 дакументальных стужак з розных краін. Фільм «Тварам да твару. Подзвіг Новікава», які расказвае пра гераічны лёс аднаго з брэсцкіх пагранічнікаў лейтэнанта Новікава, атрымаў першы прыз за графічнае афармленне і дызайн.

Дарэчы, ужо ў студзені 2018 года «Беларусь 24» прадставіць гледачам другі сезон дакументальнага праекта і раскажа пра баявы шлях 86-га Аўгустоўскага пагранатрада, спадчыннікам якога лічыцца Гродзенская пагранічная група.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

## Серада, 20 снежня

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.40 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.20 Зона Х (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Жэмчугі» (16+).**
13.10 «Дзіцячы доктар».
13.45 «Дзень у вялікім горадзе».
**14.45, 15.25 Серыял «Райскае месца» (16+).**
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 Актуальнае інтэрв'ю.
0.00 «Сфера інтарэсаў».
1.00 «Дзень спорту».

### Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 19.00 «Тэлебарометр».
**9.05, 17.05 Серыял «Жанчына ў чорным» (16+).**
10.55, 22.05 «Багіня шопінгу» (16+).
12.05, 21.10 «Тата зможа?» (16+).
12.55, 19.05 «Амерыканскі жаніх» (16+).
14.00 «Бітва салонаў» (16+).
**15.10, 23.10 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
16.15, 0.05 «Нічога сабе ньюз» (12+).
16.20, 0.10 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
20.10 «Паненка-сялянка» (16+).
22.00 Спортлато 5 з 36, «КЕНО».

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Запяканка з бульбы.
8.05, 12.00, 20.00 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.20, 12.15, 23.10 «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Зімняя вішня». Маст. фільм (12+).**
9.20, 17.55 «Апошні дзень». Яўген Еўсігнееў (12+).
10.00 «Святло далёкай зоркі». Памяці рэжысёра, драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Аляксандра Гутковіча.
**10.25 «Пацалунак Сакрата».**
**10.50 «Каралі Неферціці» (16+).**
12.20 «Старыя казкі».
12.45 «Знак лёсу». Рэжысёр Міхаіл Пташук». Дак. фільм.
13.40 «Без тэрміну даўнасці. Бумеранг-2». Дак. фільм (12+).
**14.05 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).**
15.40 «Скарына. Дзеля Бога і людзей».
16.05, 21.05 «Дзяржаўная граніца». «Афганская пастка» (12+).
19.30 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
20.10 «Беларуская кухня». Шчаўе з ліньком.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.55 «Песні пад гітару».

### Беларусь 5

8.00 Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама-Мінск».
10.00 «Кубак вайны і свету. Пралог». Дак. фільм.
10.40 Спорт-кадр.
11.10 Легенды спорту. Беларускія гісторыі.
11.40 Фактар сілы.
12.10 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. СКА-Мінск — БГК імя Мяшкова.
13.45 Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Паўфіналы. Фіналы.
15.05 Змешаныя адзінаборствы. UFC.
17.10 Слэм-данк.
17.40 Агнявы рубеж.
18.10 «Кубак вайны і свету. Перамога без трафея». Дак. фільм.
18.55 Хакей. Кубак Беларусі. Фінал. Матч у адказ. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
21.15 Баскетбол. Кубак ФІБА. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Бакен Беарз» (Данія).
23.05 Спорт-цэнтр.
23.15 Валейбол. Кубак выкліку. Мужчыны. «Будаўнік» (Мінск) — «Лазана» (Швейцарыя).

### АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 «Нашы навіны».
6.10, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
9.10 «Рыма Маркава. Слабасці моцнай жанчыны» (12+).
10.00 «Жыць здорава!» (12+).
11.05, 13.05, 16.15, 18.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор» (12+).
12.20, 13.10, 19.00 «Няхай гавораць» (16+).
13.55 «Давай пажэнімся!» (16+).
14.55 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
16.20 «Адваротны адлік». «Сямнаццаць імгненняў зімы, або Сакрэтная місія барона Мюнхгаўзена» (12+).
16.55 «На самай справе» (16+).
18.20 «Кантрольная закупка» (12+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
20.00 Час.
**21.05 «Берагчы і абараняць». Фільм 2-і (16+).**
21.55 Урачысты сход і святочны канцэрт, прысвечаны 100-годдзю органаў дзяржаўнай бяспекі Беларусі.
23.50 Начныя навіны.
0.05 «Час пакажа» (16+).

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
**8.30 «Усё, што нам трэба...» Серыял. Заключныя серыі (12+).**
**10.40, 23.05 «Настаўнікі». Серыял (16+).**
12.35 «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Камедыя «Клуб першых жонак». (12+).**
15.40 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).
16.10 «Аўтапанарама» (12+).
16.50 «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**17.35 «Разведчыцы». Серыял (16+).**
18.35 «Тайны Чапман» (16+).
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Стралок». (16+).**
0.45 Гурт «Scorpions»: канцэрт «Момант славы» (16+).

### МІР

6.20 М/ф (6+).
7.00 «Дастукацца да зоркі» (12+).
7.30 «Добрай раніцы, свет!» (16+).
8.35 «Няма праблем» (16+).
**10.00, 13.15, 19.20 Серыял «Даішнікі» (16+).**
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
14.00 «Справы сямейныя» (16+).
15.00 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 17.10, 18.05 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**23.30 Маст. фільм «Шчыт і меч». 1—4-я серыі (12+).**

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
10.40 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
**11.40, 22.10, 23.10 Серыял «Тайны следства-17». (12+).**
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
15.45 «60 хвілін». Ток-шоу.
17.35 «Лёс чалавека». (12+).
18.45 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.35 Серыял «Прынцып Хабарава». (16+).**
0.15 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.10, 7.05 «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
9.40, 23.15 «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**
**11.05 Серыял «Сведкі». (16+).**
12.00 «Суд прысяжных». (16+).
13.25, 18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «ППС». (16+).**
**16.35 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**19.40 Серыял «Ленінград-46». (16+).**
23.35 «Вынікі дня».
**0.05 Серыял «Версія». (16+).**

### 8 канал

7.00, 16.00, 19.20, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
7.05 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
7.25, 16.05 Для дзяцей «Адказвайка».
7.30 «Раніца з восьмым».
10.30 «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.00 Меладрама «Калядная ноч у Барселоне».**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.30 Камедыя «Прынцэса на Раство».**
16.10 «Мультпарад».
**16.30 Камедыя «Раство з Холі».**
**18.05 Серыял «Давяраю табе».**
18.50 «Мой любімы гадаванец» (0+).
**19.25 Серыял «Свой сярод чужых».**
20.50 «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Сем'янін» (12+).**
**23.10 Серыял «Камісар Рэкс».**

### ВТБ

6.00, 15.15 Серыял «Варонiны». (12+).
7.20 «Дурні і дарогі». (16+).
7.40, 4.20 М/ф «Дуда і Дада». (0+)
8.00, 4.30 М/ф «Смяшарыкі». (0+)
8.20, 4.50 М/ф «Маша і Мядзведзь». (6+)
8.50, 3.50 «Ералаш». (6+)
9.30 Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
10.40 Баявік «Параграф 78: фільм другі». (16+).
12.20 Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
13.00, 19.00 Серыял «Псіхалагіні». (16+).
14.10, 20.10 Серыял «Атэль «Элеон». (16+).
16.45, 5.10 Серыял «Ранеткі». (12+).
17.50 «Уральскія пельмені». (16+).
21.20 Фантастыка «Трансформеры». (12+).
0.00 Серыял «Васьмідзясятыя». (16+).
0.50 Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
1.50 Серыял «Метад Лаўровай». (16+).
3.30 «Лаві момант». (16+).

### Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00 Навіны культуры.
6.35 «Легенды сусветнага кіно». Барыс Андрэеў.
7.05 «Пешшу...» Масква Шчусева.
7.35, 21.10 «Правілы жыцця».
8.05, 22.50 «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
8.55 «Звонавая прафесія. Ліцейшчыкі». Дак. фільм.
9.15 «Мхатчыкі. Тэатр часоў Алега Яфрэмава».
9.40 Галоўная роля.
10.15, 18.05 «Назіральнік».
11.10, 0.45 ХХ стагоддзе. «Вакол смеху». 1981 год.
12.20 «Геній».
12.55 Штучны адбор.
13.35, 20.00 «Карл Вялікі». Дак. фільм. 1-я серыя.
14.30, 22.20 «Палацы падарваць і сыходзіць».
15.10 Юбілей Маскоўскага міжнароднага Дома музыкі. Выбраныя хоры а капэла. Уладзімір Співакоў і Акадэмічны Вялікі хор «Майстры харавога спеву».
16.00 «Расія, любоў мая!» «Эвены Якуціі».
16.30 «Сляпы герой. Каханне Отта Вайта». Дак. фільм.
19.00, 0.15 Урокі рускай. Чытанні. Ф. Кафка. «Прыгавор». Чытае Валерый Гаркалін.
19.45 Галоўная роля.
20.55 «Добрай ночы, малыя!»
21.40 «Абсалютны слых».
23.45 Колер часу. Павел Фядотаў.
1.55 Фрэдэрык Кемпф. Канцэрт у Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі.
2.50 «Арман Жан дзю Плесі дэ Рышэльё». Дак. фільм.

### Настальгія

6.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ролінг Стоўнз». 2005 год (18+).
7.05, 8.40, 90.40, 11.00, 12.45, 14.40, 15.40, 17.00, 18.55, 20.30, 21.40, 23.00, 1.20, 5.10 Музычная настальгія (12+).
7.30, 13.30, 19.30 Маст. фільм «Капітан Нэма». (16+).
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Самадзейнасць Краіны Саветаў». 2007 год (12+).
14.50, 20.50 «Прэс-экспрэс». 1994 год (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
0.00 «Вакол смеху». 1980 год (12+).
1.55 Праграма «Мантаж». 1988 год (16+).
2.50 М/ф «У сінім моры, у белай пене». (12+).
3.00 Маст. фільм «Кропка вяртання». (16+).

### EuroSport 1

3.00, 5.00, 11.00, 19.00, 1.30 Горныя лыжы. Кубак свету.
3.30, 12.15, 2.30 Скачкі з трампліна. Кубак свету.
6.45, 21.40 Watts.
7.00, 14.30, 22.30, 1.00 Футбол. «ФІФА».
7.30, 22.00 Біятлон. Кубак свету.
8.30 Аўтагонкі. Серыя WTCC.
9.00, 13.20, 23.00 Снукер. Scottish Open. Фінал.
10.30 Watts. Топ-10.
10.45 Фрырайдынг. White session.
15.00, 16.30 Алімпійскія гульні. «Героі будучыні».
17.00 Алімпійскія гульні. «Гонка тэхналогій».
18.30 Алімпійскія гульні. «Захапляльныя моманты».

### Кінакамедыя

0.25 Камедыя «Татулі». (16+).
2.20 Камедыя «Што вытвараюць мужчыны!-2». (18+).
3.50 Камедыя «Паслявясельны разгром». (18+).
5.30 Камедыя «Хутчэй за трусоў». (16+).
7.10 Камедыя «Румба». (12+).
8.35 Камедыя «Рымскія спатканні». (16+).
10.15 Камедыя «Настаўнік года». (16+).
12.25 Камедыя «Вячэра з прыдуркам». (12+).
14.00 Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2». (16+).
16.00 Камедыя «Усё пуцём!» (16+).
17.50 Меладрама «Каханне з першага погляду». (16+).
19.30 Камедыя «Найноўшы запавет». (16+).
21.40 Драма «Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр». (16+).
23.35 Меладрама «Выпадковы муж». (16+).

### ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.20 «Доктар І...» (16+).
7.50 «Трэндзі» (16+).
8.20, 19.00, 3.10 «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
10.00 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
11.40, 18.00 «Сляпая» (12+).
12.35, 16.55 «Варажбітка» (12+).
13.45, 4.40 «Паралельны свет» (12+).
14.45 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
15.20 «Здзелка» (16+).
16.05 «Натуральны адбор» (12+).
20.45 «Магазіна» (16+).
21.50 «Рэвізора» (16+).
23.15, 5.30 «Лінія абароны» (16+).
23.45 «Візіцёры». Серыял (16+).
0.30 «Разлом Сан-Андрэас». Фантастыка (12+).
2.20 «Гучныя справы» (16+).

### ТБ1000

6.10, 18.30 Ужо хто б казаў-2 (12+).
7.50 Блакітная лагуна (16+).
10.05 Аднакласнікі (16+).
12.05 Не здавайся (16+).
13.55 Шчаслівчык Гілмар (12+).
15.45 Легенды восені (16+).
20.10 Шакалад (16+).
22.30 Вяртанне ў Блакітную лагуну (16+).
0.30 Выратаванне (16+).
2.20 Лунацікі (16+).
4.10 Неверагодны Халк (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Трымай удар, дзетка (12+).
8.20 Блокбастар (12+).
10.00 Дзённік яго жонкі (16+).
12.05 Цень (0+).
13.50 Дзень выбараў (16+).
16.20, 4.20 Каханне і мора. 1—2-я серыі (12+).
18.30 М+Ж (16+).
20.20 Аднакласніцы (16+).
22.00 Цяжкі выпадак (16+).
0.15 Купрын. Упоцемку (16+).
2.20 Дзень выбараў-2 (12+).

### National Geographic

6.00 Займальная навука. (12+).
6.50, 9.30, 5.35 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
8.00 Сапраўдны суперкар. (12+).
8.50, 11.05 Ледзяная дарога. (12+).
10.15 Мегазаводы. (12+).
11.50, 17.15, 20.15 Аўта-SOS. (12+).
12.35 Праз мільён гадоў. (12+).
13.20 Узлом Сістэмы. (16+).
14.50 Сёмы кантынент. (12+).
15.35 Доўгая дарога дадому. (16+).
16.25, 19.30, 0.00, 2.20 Расследаванні авіякатастроф. (12+).
18.00, 21.00, 0.50, 3.55 Дзікі тунец. (12+).
18.45, 22.35 Космас: прастора і час. (12+).
21.50, 1.30, 4.45 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас (16+).
23.15 Паранармальнае. (16+).

### Discovery

8.00, 17.00, 22.00, 4.40 Махінатары. (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 6.20 Як гэта ўстроена? (12+).
10.00, 16.00, 23.00, 3.50 Паляўнічыя на склады. (16+).
11.00, 13.30 Скарбашукальнікі Амерыкі. (12+).
14.00, 7.10 Голыя і напалоханыя. (16+).
18.00, 5.30 Хуткія і гучныя. (12+).
19.00, 2.00 Залатая ліхаманка. (16+).
20.00 Бушкрафт: лясная ліга. (12+).
0.00 Узрываючы гісторыю. (6+).
1.00 Самагоншчыкі. (16+).
2.55 Космас. Пачатак. Будучыня. (12+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** На гэтым тыдні пажадана пазбягаць неабдуманых слоў і неасцярожных учынкаў, бо адрыў ад рэальнасці можа занадта дорага каштаваць. Паспрабуйце не грэбаваць некаторымі ўмоўнасцямі і праявіце рашучасць у пераадоленні цяжкасцяў. Парадуйцеся поспехам блізкіх, яны гэта заслужылі. Адкладзіце ў пятніцу дробныя справы, якія вас раздражняюць, і займіцеся рашэннем больш важных праблем. Выхадныя прысвяціце адпачынку.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні не засмучайцеся па дробязях: аптымізм дазволіць змяняць сітуацыю ў патрэбным вам кірунку. Не варта забываць, што самы просты варыянт выбару не заўсёды самы лепшы. У сераду могуць узнікнуць непрыемнасці на працы з-за вашай няўпэўненасці ва ўласных сілах і ўменнях. У суботу не варта ісці супраць грамадскай думкі, бо даказаць сваю правату вы ўсё роўна не зможаце.



**БЛІЗНЯТЫ.** Паспрабуйце не прымаць паспешлівых рашэнняў, будзьце мудрыя і прадбачлівыя, тады з лёгкасцю абміняце перашкоды і даможацеся жаданага. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі, яна падкажа самае дакладнае рашэнне ў сітуацыі і дапаможа зразумець, каму можна давяраць. Тыдзень будзе ўдалы для новых дзелавых і творчых праектаў і наладжвання адносін. У чацвер вынікі напрамую будуць залежаць ад вашай працавітасці. Выхадныя пройдуць лёгка і прыемна. Не выключана, што вы адправіцеся на спатканне і пачуеце прызнанне ў каханні.



**РАК.** Першая палова тыдня добрая для рэалізацыі вялікіх прафесійных планаў і дасягнення пастаўленых мэт. Але не ўздумайце спыняцца, калі ўсё намечанае будзе зроблена, адпачняце пазней, а час, які застаўся, лепш выкарыстайце для вырашэння яшчэ пары-тройкі задач. Звычкі здабудуць над вамі асаблівую ўладу, з імі давядзецца лічыцца, а спробы перамагчы шкодную, з вашага пункту гледжання, прыхільнасць варта адкласці да лепшых часоў. На другую палову тыдня пажадана не планаваць важных спраў і адказных сустрэч.



**ЛЕЎ.** Вам трэба не распыляцца, а засяродзіцца на самых важных справах у дадзены момант. Абставіны могуць спрыяць прыняццю сур'ёзнага рашэння. Давядзецца адстойваць свае інтарэсы ў адносінах з партнёрамі. Рэальна разлічвайце сілы, на працы паспрабуйце вырашаць толькі тыя пытанні, якія маюць да вас непасрэднае дачыненне. У аўторак пастарайцеся пазбягаць канфліктаў і авантур, багатых стратамі. Найбольш спрыяльным днём для вас на гэтым тыдні будзе пятніца.



**ДЗЕВА.** Не самы спакойны тыдзень. Калегі, якія яшчэ нядаўна насцярожана ставіліся да вашай ініцыятывы, цяпер з задавальненнем скінуць частку сваёй працы на вас. Аднак рашэнне шматлікіх праблем вам якраз па сіле. Дапамога сяброў спатрэбіцца толькі ў крайнім выпадку і толькі ў панядзелак. У аўторак разлічвайце толькі на свае сілы, прапускайце міма вушэй «слушныя парады». У чацвер можа паступіць прывабная прапанова, але перш, чым даць згоду, падумайце, ці трэба вам нешта мяняць.




## НЕ ВЕДАЮЧЫ БРОДУ...

Гэта здарылася са мной у Сенегале, на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна.

Ну каму б у спёку (больш за 30 градусаў) ды пасля доўгай экскурсіі па горадзе не захацелася б ім пакупацца?!

Вось і мы з задавальненнем кінуліся ў ваду: нават на імгненне не задумаліся, можна гэта ці не.

Я, напрыклад, досыць далёка адплыў ад берага, стаў на ногі, каб трохі аддыхацца, і адчуў, што ў пяту мне штосьці ўкалола. Адразу ж пераступіў на другую нагу — ёй таксама перапала. Прычым адчуванні ад уколаў былі настолькі непрыемныя, што я тут жа паплыў да берага.

А там і высветлілася, што ў вадзе абедзвюма нагамі я наступіў на... марскіх вожыкаў, што іголкі іх, уткнуўшыся ў падэшвы, месцамі зламаліся...

Выцягваць тое, што засталося, было надзвычай цяжка: здаецца, ухопіш за кончык... І яго ж адарвеш. Уся астатняя «стрэмка» застаецца ў назе. А ўжо колецца...

У кішэні ў мяне быў сцізорык, і таму разам з іголкамі я (дзе сам, дзе з дапамогай таварышаў) стаў выразаць кавалачкі скуры.

...З вялікай цяжкасцю, кульгаючы на абедзве нагі, я дабраўся да свайго цеплахода. Абувацца не мог, бо ногі распухлі. Але ж здавацца не выпадала: я працягваў «ваяваць» са стрэмкамі, і нарэшце наступіў той час, калі іх не засталося.

Так на сваёй уласнай скуры (у поўным сэнсе гэтага слова) я праверыў мудрасць нашай прыказкі «Не ведаючы броду, не суньмя ў воду».

**П. Сачыўка,**
*в. Цырын, Карэліцкі раён.*

## ПРЫБОР УНІВЕРСАЛЬНЫ

Не ведаю як хто, а я дык люблю пасядзець, пагаварыць з унукамі (у мяне іх трое — два студэнты і школьнік).

Дык вось неяк завялі мы гутарку аб прыладах для пісьма. Я ў прыватнасці, папытаўся: ці ведаюць яны, што было спачатку, што потым?

Адказы былі розныя і досыць цікавыя. Пра гусінае пяро сказалі ўсе. Можа таму, што ў падручніках па літаратуры ёсць вядомы малюнак Пушкіна. Потым назвалі крэйду, вугаль, аловак, фламастары... Малодшы яшчэ ўспомніў пра балончыкі з фарбай, што выкарыстоўваюць аматары графіці.

— А што такое аўтаручка? — папытаўся я.

Унукі дружна паказалі на свае шарыкавыя...

З аднаго боку яно блізка, відаць, але ж я зрабіў экскурс у гісторыю — расказаў спачатку пра асадкі.

Ручкі гэтыя, хто не ведае, складаліся з драўлянай палачкі, у якую ўстаўлялася пяро — «зорачка» або «жабка». Яго мачалі ў чарніла (водны раствор фарбавальніка), якое захоўвалася ў спецыяльных шкляных чарніліцах. (Асаблівасць іх была ў тым, што вадкасць адтуль амаль не вылівалася нават тады, калі ёмістасць кулялася набок альбо наогул перакульвалася.)

Пісаць пяром — тоненька або з націскам — была асобая навука і асобая праца. Часопіс «Вожык» нават рубрыку меў «Пяро нарыпела»...

На змену асадкам прыйшлі аўтаручкі, якія чалавек ужо сам запаўняў чарнілам з адмысловай бутэлечкі. І толькі потым з'явіліся сучасныя ручкі са стрыжнем.

...Помню, прывезлі такое дзіва і Пятровічу, калгаснаму старшыні. Што важна, прывезлі з замежжа і якраз на Вялікдзень. І вось першы працоўны дзень пасля яго, ранішняя нарада. Глядзіць старшыня на сваіх арлоў-спецыялістаў, а тыя твары свае хаваюць — пахмяліліся зранку, хоць з гэтым у гаспадарцы вельмі строга было.

— Колькі на грудзі ўзяў? — пытаецца старшыня ў чырванашчокага брыгадзіра.

— Пятровіч, праўду кажу: сёння — ні грамулькі, толькі кубак чаю, — апраўдваецца той.

— А мы праверым, — сказаў старшыня і дастаў з кішэні шарыкавую ручку. Некалі разоў папстрыкаў ёй (маўляў, глядзіце, прыбор працуе) ды паднёс да вуснаў брыгадзіра:



— Дзьмі.

Той аднак не спяшаўся: ён ужо чуў ад кіроўцаў, якія ездзілі ў камандзіроўкі, што работнікі ДАІ цяпер «узброены» спецыяльнымі трубачкамі — варта падзьмуць, калі піў, — яна тут жа ссінее...

А старшыня між тым чакаў. Так што дзявацца не было куды: прыйшлося ціхенька хукнуць.

— Зараз паглядзім, — паабяцаў Пятровіч і, разабраўшы ручку, паказаў... сіні-сіні стрыжань. — Ды ты, браток, амаль паўлітра кульнуў?

— Не! Як бог на небе: два кілішкі — не болей.

— Ну, хто яшчэ два кілішкі? — старшыня глядзеў па мужыкоў.

— Дык жа свята якое, Пятровіч! — зашумелі тыя. — Прабач.

— Добра, — пагадзіўся старшыня. — На сёння выбачаю, але ж майце на ўвазе, што алкатэстар у мяне цяпер ёсць, і яго не падманеш.

Мужыкі паверылі — за чыстую манету прынялі.

Засумняваліся толькі потым: пасля таго, як Пятровіч, у іх на вачах, алкатэстарам... падпісаў нейкую паперыну.

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

## ЦУДАДЗЕЙНЫ СРОДАК

Не так даўно (гл. «Звязда» ад 24.11) я пісала, як жонка «палячыла» свайму мужу жывот — анілінавым фарбавальнікам. Зараз раскажу, як муж (ужо іншы) вылечыў жонцы радыкуліт.

Пра лекі звычайна кажуць, што яны адно лечаць, другое калечаць. Тут якраз гэткі выпадак.

Жылі-былі, значыць, Хведзька з Анютай. Добра жылі, бо Анюта была людскай жанчынай і дбайнай гаспадыняй.

І Хведзька яе таксама не зломак — здабытчык, дальнабойшчык, добра зарабляў, усю вялікую краіну аб'ехаў «ад Масквы да самых да акраін», меў «падвязкі» ў Прыбалтыцы. А тады ж гэта «чыста захад», амаль капіталізм. І ўсё ў Хведзькі было: і «Рыжскі бальзам», і эстонскі лікёр «Вана Талін», і сасіскі, якіх тады не бачыў ніхто, і піва «Таўрас»...

Усё гэта Федзьку «падганялі» яго прыбалтыйскія сябры. А ён ім вяленых ляшчоў з нашага Дняпра... Сустрэнуцца, тое піва п''юць ды гамоняць. Прыбалты кажуць, што трэба грошы з кніжак здымаць ды купляць даляры, бо гэта валюта. А нашы хлопцы хіба пасміхаюцца: навошта?

Трэба было прыбалтаў слухаць.

...Але ж адно дрэнна: нягледзячы на працвітанне сям'і, даймалі Анюту болі ў спіне. І ніякія, нават прыбалтыйскія, сродкі ёй не памагалі. Бывала, прыедзе Хведзька з рэйса — яму б «расслабіцца», «сужэнцкі абавязак» выканаць, а жонка ледзь не крыкма крычыць: нават не набліжайся, маўляў.

То неяк аж з Алтая прывёз ёй Хведзька цудадзейны сродак: рэцэпт мясцовых шаманаў — злоўленыя ў поўню гадзюкі, скарпіёны і яшчэ нейкія пачвары, настоеныя на спірце з пякучым перцам. (Як казаў незабыўны Задорнаў, сродак па рэцэпце гімалайскай бабулі Фросі, ад якога яна і памерла.)

Дык вось, значыць, скруціла Анюту — ні ахнуць, ні ўздыхнуць. Хведзька палажыў яе на жывот, на вялікую падушку, і пачаў «звышчэнадзейнічаць»: нальe, значыць, трошкі сродку на балючае месца і расцірае пакрысе.

Як прызнала хворая, — спіне пацяплела, боль стаў сціхаць.

Тады муж яе вырашыў паскорыць «лячэнне» — плюхнуў сродку ўжо не шкадуючы, ды так, што расцерці не паспеў: той па «жалабку» на спіне «пабег» уніз, да галоўнага жаночага органа.

«Уздзеянне» было маментальнае: Анюта ўскрыкнула, падхапілася, быццам ніякага радыкуліту не было, схапіла кіёк, з якім да гэтага соўгалася па хаце, і, успомніўшы Хведзькаву маці (хоць ставілася да яе з найвялікшай пашанай), «перацягнула» ім па мужавым плячы. А потым куляй панеслася змываць тыя лекі...

Доўга мыла — зацягнуўся «працэс», гора было для Хведзькі.

Але ж радыкуліт сваёй жонцы ён вылечыў!

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## ДУРНЫЯ ЖАРТЫ ПАХВАЛЫ НЕ ВАРТЫ

Маладымі мы любілі пажартаваць, асабліва з дзяўчатамі. У нас на хімзаводзе ў той час няцяжка было знайсці, напрыклад, здохлую мыш. Яшчэ лягчэй — падлажыць яе ў пакінутыя на стале жаночыя пальчаткі... З усімі адсюль наступствамі.

Яшчэ адну неспадзяванку мы рыхтавалі ў спёку. На тэрмометры, напрыклад, плюс 30. На вуліцы — няма чым дыхаць. Што ўжо казаць пра вытворчыя памяшканні...

Дык мы да дзяўчат з «сюрпрызам»: нехта з хлапцоў бярэ гумавую пальчатку, напаўняе яе халоднай вадой і потым гэтую «бомбу» скідвае праз мантажны праём.

Шок быў — яшчэ той, але ж з «порцыяй» прахалоды... Таму ўслед «бамбардзіроўшчыку» ляцела хіба некалькі моцных слоў — і не болей.

Былі яшчэ дурнейшыя жарты. Адзін малады чалавек, каб звярнуць на сябе ўвагу дзяўчыны, нічога лепшага не прыдумаў, як уткнуць ёй у вуха трубку, з якой ішло сціснутае паветра.

Гэты жарт скончыўся тым, што ініцыятар атрымаў вымову і пазбавіўся прэміі за хуліганства на працоўным месцы. Ён жа з уласнай кішэні аплаціў пацярпелай лісток непрацаздольнасці.

Перапала неяк і мне. Іду, значыць, па вуліцы, а наперадзе, бачу, знаёмая.

Закарцела пажартаваць: дагнаў яе, ухапіў за сумачку.

Можа, там грошай многа было, можа, яшчэ якая прычына, але дзеўка спужалася так, што я і сам зарокся жартаваць, і іншых стрымліваў. А тым больш — у адносінах да дзяўчат ды маладзіц, бо ці мала што...

**Мікалай Старых.**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

## Неасабісты суб'ектыў

# КАШТОЎНЫ ПАДАРУНАК



### Калі Бог даў жыццё, не трэба ім грэбаваць

З Ксеняй як пагаворыш па тэлефоне — настрой на некалькі гадзін сапсуеш дакладна. Таму званіць ёй стараюся як мага радзей, хоць сумленне часам і тузае: сяброўка ўсё ж, колькі гадоў — яшчэ са школьных алімпіяд — знаёмыя. Вітаюся, пытаю дзяжурнае: «Як справы?» І тут пачынаецца... Жыццё не задалося, надвор'е дрэннае, чарговы кавалер сышоў, з бацькамі паразумення няма, на працы ўсе дурні беспрасветныя. Усё гэта я колькі разоў чула, таму спакойна выслухоўваю спіч, кажу зноў жа дзяжурнае: «Ну, ты там трымайся» і з пачуццём выкананага абавязку кладу трубку.

Гэтым разам усё было яшчэ горш. Ксеня сабралася... паміраць. На маё дзяжурнае: «Як справы?» слабенькім такім голасам адказала: «Давай дзе-небудзь сустрэнемся, а то, можа, больш не прыйдзецца...» Едучы ў той жа вечар да яе ў Малінаўку, я ўвесь час думала, што магло здарыцца, бо, калі бачыліся летам, Ксеня выглядала вельмі нават добра. Яна тады з'ездзіла на мора (праўда, скардзілася, што вартай кампаніі не было, сядзела ў нумары і плакала), была загарэлая, з новай прычоскай... Яна адчыніла дзверы бледная, без макіяжу, ледзь чутна сказала: «Праходзь». Сядзела на канапе, падсцнуўшы ногі, кутаючыся ў нейкую бясформенную шэрую кофту, расказвала пра сваю бяду. Абмацала на плячы нейкі гузачок, тут жа панеслася ў паліклініку, здавала аналізы ды па ўрачах. Тэрапеўт супакоіла: звычайны жыравік. Але, бачачы трывогу пацыенткі, якая ўвесь час недаверліва перапытвала, ці праўда, што няма небяспекі, выпісала накіраванне да анколага.

Вось над гэтым накіраваннем Ксеня і гаравала. Да спецыяліста яна не пайшла, паставіла сабе «дыягназ» сама і ў свае сорак два пачала падводзіць вынікі і ставіць кропкі. Я, шчыра, у той вечар старалася яе ўсяляк разварушыць. Але ні разумныя словы, ні спробы жартаваць, ні нават выпіты ў значнай колькасці каньяк не дапамаглі. Выйшаўшы з яе самотнай кватэры ў золкую цемру, некалькі разоў смачна ўдыхнула цяжкога вільготнага паветра, спрабуючы прагнаць паганыя думкі і не менш паганы настрой.

РАПТАМ нехта гукнуў мяне па імені. Азірнулася: даганяе жвавая кабета з палкамі для скандынаўскай хадзьбы. Наталля Яўгенаўна, з якой калісьці разам працавалі і з якой не бачыліся ўжо гадоў пяць, прывеітлива ўсміхалася, тлумачыла: «Я ж тут жыву недалёка. Цэлы дзень сёння бегала: у басейн схадзіла, у паліклініку, да свекрыві зайшла, прадукты ёй занесла, есці наварыла, прыбралася... Позна ўжо, але думаю: не, пайду прайдуся ўсё-ткі. Нельга сабе паблажкі рабіць...»

Наталлі Яўгенаўне без малога семдзесят. Праўда, убачыўшы на вуліцы такую дагледжаную маладжавую пані, наўрад ці хто пра гэта здагадаецца. Як і пра тое, якія пакручасты лёс, якія выпрабаванні выпалі на долю жанчыны. Яна і расказвала пра гэта нам, сваім маладзейшым калегам лёгка, нібы прачытала ў якой кнізе, а не сама пражыла-прагаравала хвіліну за хвілінай, год за годам.

Яна выйшла замуж па тагачасных мерках позна — было ўжо за трыццаць. Шукала свайго, адзінага — знайшла: пажаніліся па вялікім узаемным каханні. Шчаслівыя сужэнцы ўжо чакалі першынца, але лёс распарадзіўся па-свойму: грып, ускладненні — дзіця так і не нарадзілася. Бяда, кажуць, адна не ходзіць — праз паўгода ў мужа, якому толькі споўнілася трыццаць два, проста на працы спынілася сэрца. Пахавала, адплакала, з галавой паглыбілася ў работу, якая была адзіным выратаваннем ад тугі і самоты. Старалася, бралася за самыя складаныя заданні...

Таму, калі ў 86-м выбухнуў Чарнобыль, на месца падзей адправілі менавіта яе (працуе аператыўна, сям'і няма — так меркавала начальства). Тады мала хто ведаў пра рэальную небяспеку той аварыі, і па палескіх вёсках, адкуль тэрмінова адсялялі людзей, яна гойсала ў кашулі з кароткімі рукавамі, у лёгкай хусцінцы на галаве... Вынік той камандзіроўкі даў сябе адчуць літаральна праз год — страшны дыягназ, доўгае лячэнне ў Мінску, Маскве, за мяжой і немагчымасць нават спадзявацца калі-небудзь мець дзіця.

ЁЙ, праўда, заўсёды было пра каго клапаціцца. Пахаваўшы ў хуткім часе бацьку, пераехала ў кватэру да маці, якая засталася адна. Маці аднойчы проста не ўстала — адняліся ногі. Ляжачай пражыла яшчэ дзесяць гадоў, і ў дачкі нават думкі ніколі не ўзнікла здаць яе на якія сацыяльныя ложак. Калі маці не стала, яна сама ўжо была на пенсіі, хоць працягвала працаваць... А свякроў, у якой быў толькі адзін сын, з якім Наталля пражыла свае шчаслівыя паўтара года, дажыла да глыбокай старасці, і ўвесь гэты час нявестка даглядала яе, не зважаючы на ўласны ўзрост і балячкі, якіх з кожным годам не меншае...

Распытаўшы пра мае справы, расказаўшы пра свае надзённыя клопаты, якіх, як заўсёды шмат, Наталля Яўгенаўна сказала мне сваё каронная, што гаворыць на развітанне пры кожнай сустрэчы: «За ўсімі сваімі важнымі справамі не забывайся пра сябе, не забывайся жыць. Бо, калі Бог даў жыццё, не трэба гэтым каштоўным падарункам грэбаваць...»

ЗДАЕЦЦА, менавіта ў той золкі вечар я па-сапраўднаму зразумела, што яна мела на ўвазе.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

